Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 30 1933 г. НЯДЗЕЛЯ № 166 (4710) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

УСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧКА АБ УБОРЦЫ І ЗАГАТОЎКАХ

Выступленьне тав. ГІКАЛО

Учора ўвечары адбылася ўсебеларуская радыё-пераклічка, прысьвечаная пытаньню правядзеньня ўборкі ўраджаю і загатовак.

Пераклічкай кіравалі сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО і старшыня ЦКК КП(б)Б тав. ЛЫЧОЎ. У студыі Бел радыёцэнтру прысутнічалі таксама: нач. палітсэктару Наркамзему БССР тав. РАТНЭК, заг. агітмасавага сэктару ЦК КП(б)Б тав. ПЫЖЫКАЎ, сакратар ЦВК БССР т. ГНІЛЯКЕВІЧ, нам. НКЗ БССР тав. СТРЭЛЕ, нам. упаўнаважанага камітэту загатовак пры СНК СССР па БССР тав. МАЛАШОНАК і інш.

З інфармацыямі аб ходзе ўборкі і здачы прадукцыі дзяржаве выступілі: т. БЭРНШТЭЙН (старшыня інтэрнацыянальнага калгасу «Чырвоная армія», Рагачоўскага раёну), тав. БЛОЦКІ (брыгадзір калгасу «Чырвоны сьцяг», Мазырскага раёну), тав. НЕХАЙ (старшыня Хутарскага сельсавету, Чэрвеньскага раёну), тав. МАЕЎСКІ (Трускі сельсавет, Капыльскага раёну), тав. НОВІК (Навасельскі сельсавет, Хойніцкага раёну).

Пасьля інфармацый з месц і ажыўленай гутаркі з выступаўшымі таварышамі, з вялікай прамовай аб задачах сваячасовай уборкі ўраджаю і першачарговага выкананьня абавязкаў па здачы прадукцыі дзяржаве выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. М. Ф. ГІКАЛО.

Сёньня спаўняецца 30 год з дня адкрыцьця II-га зьезду партыі

„Бальшавізм існуе, як плынь тэарытычнай мысьлі і як палітычная партыя з 1903 году. Толькі гісторыя бальшавізму за ўвесь пэрыяд яго існаваньня можа здавальняюча вытлумачыць, чаму ён мог выпрацаваць і ўтрымаць пры самых цяжкіх умовах жалезную дысцыпліну, неабходную для перамогі пралетарыяту“ (ЛЕНІН)

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАТА

Як плынь палітычнай мысьлі і як палітычная партыя, бальшавізм узьнік, паводле азначэньня Леніна, у 1903 г., атрымаўшы афармленьне на другім зьезьдзе нашай партыі. З гэтага факту ясна тое вялізарнае значэньне, якое мае дата другога зьезду для ўсёй далейшай гісторыі нашай партыі, разам з тым і для міжнароднага бальшавізму.

Аднак, перш чым бальшавізм аформіўся, як закончаная палітычная плынь і як партыя, ён прарабіў вялікі шлях свайго перадгістарычнага разьвіцьця, правёў жорсткую барацьбу з рознага роду апартуністычнымі плынямі ўнутры тагачаснай [illegible] паставіўшы на вялізарную вышыню агульныя пытаньні марксыцкай тэорыі.

Выходзячы з правільнай ацэнкі змагаючыхся клясавых сіл, на аснове найглыбейшага аналізу ТЭНДЭНЦЫЙ гаспадарчага і палітычнага разьвіцьця Расіі, бальшавізм у асобе Леніна ўжо на парозе 20-га стагодзьдзя паставіў выключнай важнасьці праблемы, якія былі зьвязаны з задачамі новага пэрыяду — «эпохі імпэрыялізму і пралетарскай рэвалюцыі».

Патрабавалася вялізарная тэарытычная і практычная партыйна-палітычная работа Леніна, разгорнутая ім задоўга да зьезду (прыблізна з 1894 г.), якая забясьпечвала далейшае афармленьне бальшавізму, меўшае месца, як мы ўказалі, на другім зьезьдзе партыі ў 1903 годзе.

У сваіх тэарытычных работах, якія датычаць высьвятленьня ЭКАНАМІЧНАГА становішча Расіі ў канцы XIX і ў пачатку XX стагодзьдзя, і ў сваіх шматлікіх артыкулах і брашурах, якія даюць ацэнку палітычных задач і ставяць праграмна-тактычныя задачы для партыі, Ленін падымае на вялізарную вышыню пытаньні тэорыі марксызму, намячаючы ў гэты пэрыяд рад важнейшых ідэй, якія складаюць зараз сапраўды жалезны інвэнтар ідэйнага ўзбраеньня бальшавізму.

Мы бачым, што ўжо ў сваім раньнім творы «Што такое прыяцелі народу» (напісан у 1894 г.) Ленін з усёй выразнасьцю ставіць пытаньне аб пераможнай камуністычнай рэвалюцыі як задачы, пастаўленай гісторыяй перад расійскім пралетарыятам.

У ажыцьцяўленьне гэтай задачы расійскі пралетарыят павінен быў павесьці барацьбу за зьвяржэньне царскага самаўладзтва, як важнейшай перашкоды да ўсягненьня гэтай канчатковай мэты. Змагаючыся за падрыхтоўку буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, пралетарыят павінен узяць на сябе ролю гегемона і ўзначаліць барацьбу з царызмам усіх рэвалюцыйных і апазыцыйных груп. У свой час самы час Ленін, спасылаючыся на словы Маркса ў «Камуністычным заніфасьце», узмоцнена падкрэсьліваў, што толькі пралетарыят зьяўляецца адзіна пасьлядоўным да канца барацьбітом за справу сацыялізму. Распрацоўваючы праграмныя пытаньні ў канцы 90 гадоў абмяркоўваючы праект праграмы, які падрыхтоўваўся рэдакцыяй «Искры» для другога зьезду, Ленін ставіць у якасьці важнейшага пытаньня, пытаньне аб дыктатуры пралетарыяту, вельмі добра разумеючы, што толькі ажыцьцяўленьне гэтага патрабаваньня дасьць магчымасьць пралетарыяту і яго партыі выканаць сваю гістарычную місію. Ужо ў гэты пэрыяд Ленін цесна зьвязвае праблему падрыхтоўкі буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі з барацьбой за рэвалюцыю пралетарскую, ставячы пытаньне аб перарастаньні адной у другую. Пад гэтым пунктам гледжаньня ён падыходзіць і да саюзьнікаў пралетарыяту ў асобе сялянства, прыгнечаных калініяльных народаў і г. д. Аналізуючы становішча і ролю дробных вытворцаў, адзначаючы вялізарную помку патрыярхальных адносін у разьвіцьці капіталізму ў Расіі, Ленін намячае задачы нашай партыі ў галіне работы сярод сялянства, ставячы важнейшай мэтай адарваньне шырокіх бядняцкіх і сярэдняцкіх сялянскіх мас на бок пралетарыяту.

Ленін вельмі добра разумеў, што ажыцьцяўленьне ўсёй гэтай праграмы намысліма бяз моцнай, маналітнай, згуртаванай партыі пралетарыяту і ён ставіць свой цэнтральнай задачай якраз за ўвесь гэты пэрыяд падрыхтоўку да стварэньня такой партыі і выхаваньне кадраў прафесыянальных рэвалюцыянэраў, здольных стаць на чале партыйнай барацьбы.

Нарэшце, ажыцьцяўляючы сувязь тэорыі з практыкай, з масавай барацьбой рабочых, Ленін прыкладае вялізарныя намаганьні да таго, каб уцягнуць гэтыя масы ў клясавую палітычную барацьбу, разьбіваючы ўсякага роду спробы апартунізму накіраваць гэту барацьбу па лібэральным шляху, па шляху прыстасаваньства да інтарэсаў капіталу. Вось чаму, як мы бачым, Ленін аддае такую выключную ўвагу барацьбе з усякага роду апартуністычнымі плынямі ўнутры рабочага руху і ўнутры партыі. У сваёй геніяльнай брашуры «Што рабіць?», напісанай ім перад другім зьездам, ён змагаецца за рэвалюцыйны пралетарскі сьветапогляд, рашуча выступаючы супроць апартуністаў і у першую чаргу супроць рабочадзельства, як адной з горшых рознавіднасьцяй апартунізму, які прабаваў тады весьці барацьбу супроць партыі, супроць арганізацыйных поглядаў Леніна і «Искры» і які патураў усякага роду саматужніцтву і сэпаратызму ў рабоце тагачасных сацыял-дэмакратаў.

Вялізарную ролю і значэньне ў барацьбе за рэвалюцыйную тэорыю, за вытрыманую, згуртаваную, цэнтралізаваную партыю адыграла газэта «Искра», арганізаваная Леніным у канцы 1900 г. «Искра» зьявілася бліскучым прапагандыстам ленінскіх ідэй, ленінскай пабудовы партыі, і ў гэтым сэнсе «Искра» павінна быць названа першай бальшавіцкай газэтай. Рэдакцыя «Искры» ва ўсіх сваіх асноўных прынцыповых установках зыходзіла з ленінскіх паражнянь няў і зьяўлялася ня толькі ідэалёгічным, але і вялізарнай важнасьці практычным цэнтрам па арганізацыі партыі. А сам Ленін, як вядома, разгортвае кіпучую дзейнасьць, зьвязваючыся праз арганізацыю «Искры» і іскраўцаў з расійскімі арганізацыямі, настойна працуючы па згуртаваньні партыі і падрыхтоўцы другога зьезду. Другі зьезд нашай партыі, які сабраўся 30 год таму назад (30-га ліпеня—23-га жніўня 1903 году), спачатку ў Брусэлі, а потым перанесены ў Лёндан, прыняў распрацаваную «Искрой» праграму партыі, а таксама цэлы рад важнейшых тактычных і арганізацыйных пастаноў і выбраў цэнтральныя органы партыі.

Сабраны ў нелегальных умовах, ня гледзячы на шалёнае прасьледаваньне царскага самаўладзтва, зьявіўшыя арэнай ажыўлёных дыскусій і барацьбы паміж рэвалюцыйным крылом тагачаснай с.-д. і ўсякага роду апартуністычнымі элемэнтамі, зьезд меў вялізарнае партыйна-палітычнае значэньне для ўсёй далейшай работы ня толькі нашай партыі, але і міжнароднага пралетарыяту. Ня гледзячы на пасобныя рашэньні (напрыклад, па пытаньні аб па графе першым статуту, прынятым у фармулёўцы Мартава супроць Леніна і г. д.), другі зьезд у вогуле прыняў важнейшыя рашэньні ў духу пасьлядоўнага марксызму, асудзіўшы апартуністычныя ўстаноўкі бунду, рабочадзельства і іншых антыіскраўскіх плыняй. Зьезд разгортвае барацьбу на два фронты па нацыянальным пытаньні, выступаючы пад кіраўніцтвам Леніна і супроць сэпаратызму, і нацыяналізму Бунду, і супроць недавацэнкі нацыянальнага пытаньня з боку с.-д. Польшчы і Літвы.

«Перш чым аб'яднацца, трэба разьмежавацца» — пісаў Ленін яшчэ ў 1900 годзе. Сьледуючы гэтай дырэктыве, іскраўская большасьць зьезду рашуча разьмежавалася з усімі апартуністычнымі плынямі сацыял-дэмакраты, а пад кіраўніцтвам Леніна пытаньні барацьбы за артадаксальны марксызм і за моцную партыю былі пастаўлены на зьезьдзе на вялікую прынцыповую вышыню.

Аднак, ня гледзячы на вялікі крок наперад, які робіць сацыял-дэмакратычны рух у разультаце скліканьня другога зьезду, тыя партыйныя бальшаўцы фармулёўкі, тыя важнейшыя пазіцыі прынцыповага парадку, якія становілі прынятыя зьездам, аказаліся, як гаварыў Ленін, яшчэ не па плячы частцы сацыял-дэмакратыі, якая не змагла падысьці правільна да партыйных рашэньняў.

«Сьвежы вецер аказаўся — піша Ленін яшчэ надта сьвежым для прывыкшых да тухлай абываталь шчыны», для прыхільнікаў гурткоўшчыны. А стары апартунізм, разьбіты дашчэнту «Искрой», адрадзіўся адразу-ж пасьля зьезду пад маскай меншавізму, які непажадаў падначаліцца рашэньням партыі і працягваў і пасьля зьезду сваю дэзарганізатарскую работу.

Абсалютна мае рацыю Ленін, калі ён у сваёй прадмове да зборніка « За 12 год» піша: «Кідаючы агульны погляд на барацьбу дзьвёх плыняй у рускім марксызьме, нельга, ня прыйсьці да вываду, што «легальны марксызм», эканамізм і «меншавізм» становяць сабою розныя формы праяўленьня адной і той жа гістарычнай тэндэнцыі — тэндэнцыі апартунізму, якая рашуча змагалася на працягу ўсёй нашай партыйнай гісторыі з рэвалюцыйным бальшавізмам.

Другі зьезд нашай партыі пазначыў агромадны, важнасьці новую веху ў разьвіцьці клясавай барацьбы пралетарыяту, веху, зьвязаную з ленінскім этапам разьвіцьця нашай тэорыі, пераходам на вышэйшую ступень гэтай барацьбы. Барацьба за пралетарскую рэвалюцыю, барацьба за дыктатуру пралетарыяту, барацьба за перарастаньне, за саюзьнікаў пралетарыяту ў рэвалюцыі — усё гэта адкрывае новую старонку ня толькі ў нашай партыі, але і самым цесным чынам увязваецца з барацьбой рэвалюцыйнага бальшавізму на міжнародным арэне. Ужо тады з поўнай відавочнасьцю выявілася, што барацьба Леніна за партыю, за рэвалюцыйную стратэгію і тактыку, супроць апартунізму, —гэта барацьба разгортваецца ня толькі ў вузкіх расійскіх рамках, але і цесна зьвязваецца з барацьбой рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі супроць апартунізму на міжнародным арэне. Вось чаму другі зьезд нашай партыі зьяўляецца важнейшай датай барацьбы рэвалюцыйнага марксызму супроць міжнароднага апартунізму.

Вялізарнае значэньне мае другі зьезд для далейшай барацьбы расійскага пралетарыяту і для пераможнага завяршэньня найвялікшых рэвалюцыйных баёў, якія разгортваюцца ў першую расійскую рэвалюцыю 1905 году і ў лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі 1917 г. Уся партыйная гісторыя пацьвярджае гэта цьвёрдымі фактамі.

Вось чаму такія цесныя міці зьвязваюць наша спаўнае бальшавіцкае мінулае з нашым цяперашнім. Мы бачым, які вялізарны вопыт успрыняў нашай партыяй у разультаце 30-гадовай непрымірымай рэвалюцыйнай барацьбы, праробленай рабочай клясай пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў.

Мы бачым, што тыя задачы, якія стаялі Ленін у гэты пачатковы пэрыяд нашай партыйнай гісторыі перад партыяй, як мэту далейшай барацьбы, у сучасны момант ужо праведзены ў жыцьцё. Вось чаму дата другога зьезду зьяўляецца найвялікшым трыумфам у разьвіцьці і ўмацаваньні ідэі бальшавізму.

Мы бачым, як наша партыя ў новых умовах, у абстаноўцы дыктатуры пралетарыяту, у момант, калі ўжо краіна ўступіла ў пэрыяд сацыялізму, кіруючыся накопленым рэвалюцыйным вопытам мінулага, выконвае сваю сусьветна-гістарычную задачу.

Мы бачым, што наша партыя пад геніяльным кіраўніцтвам Сталіна прасоўвае марксыцка-ленінскую тэорыю на новую вышыню, ператвараючы ў жыцьцё тыя найвялікшыя заветы, якія былі пакінуты ёй у спадчыну Марксам—Энгельсам—Леніным.

Мы бачым, як тое жалезнае адзінства і згуртаванасьць, за якія так рашуча змагаўся Ленін на зары стварэньня нашай партыі, становяцца магутным вагаром у ажыцьцяўленьні найвялікшых задач, а правадыр і тэарэтык нашай партыі і міжнароднага пралетарыяту тав. Сталін дае нам узоры новых найвялікшай важнасьці абагуленьняў, кіруючыся марксыцка-ленінскай тэорыяй, ставячы яе на службу новых найвялікшых перамог.

М. САВЕЛЬЕЎ.

НА ЗДЫМКУ: Іскраўцы большасьці (з партрэтаў музэю рэвалюцыі)

ТРЫЦЦАТАЯ ГАДАВІНА ДРУГОГА ЗЬЕЗДУ ПАРТЫІ

(30 ліпеня 1903-1933 г.)

На II зьезьдзе бальшавізм упяршыню аформіўся і на ім-жа былі высунуты асноўныя прынцыпы бальшавізму, праграма і тактыка партыі і арганізацыйны статут партыі. Такім чынам II зьезд можна лічыць асноўным зьездам нашай партыі.

Уладзімер Ільліч Ленін працаваў над стварэньнем партыі яшчэ да II зьезду, выкарыстаўшы для гэтай работы вялізарнейшыя працы і практычную работу заснавальнікаў рэвалюцыйнай тэорыі рабочай клясы — работы Маркса і Энгельса.

За некалькі год да II зьезду Уладзімер Ільліч стварыў арганізацыю «Искра». У яе ўваходзілі найбольш вядомыя тэарэтыкі і практыкі рэвалюцыйнага марксызму таго часу. Адначасова з заграничным цэнтрам унутры царскай Расіі працавала расійская арганізацыя «Искры», якая складалася з тагачасных аднадумцаў Уладзімера Ільліча Леніна, меўшых ужо вопыт рэвалюцыйнай барацьбы ў царскай Расіі. Гэта аб'яднаная арганізацыя «Искры» павінна была выпрацаваць праграму і статут партыі, практычна падрыхтаваць тагачасныя камітэты партыі да ўспрыняцьця асноўных ідэй і тактыкі рэвалюцыйнага марксызму і працаваць над правядзеньнем гэтых ідэй у шырокія масы рабочай клясы і сялянства. Тыя праекты праграмы партыі, якія выпрацоўваліся Пляханавым (які ў той час лічыўся адным з самых моцных с.-д. тэарэтыкаў), падпалі пад самую жорсткую крытыку з боку Уладзімера Ільліча. Напрыклад, у V томе твораў (выд. 2-ое, стар. 35) ёсьць водгук Леніна аб другім праекце праграмы, складзеным Пляханавым. У гэтым водгуку Ленін указвае на рад буйнейшых хібаў гэтага праекту Пляханава. Гэтыя хібы паказвалі, наколькі далёкі быў Пляханаў ужо тады ад рэвалюцыйнай практыкі. У першым пункце гэтага водгуку Ленін гаворыць:

«ПА СПОСАБУ ФАРМУЛЁЎКІ ВАЖНЕЙШАГА АДДЗЕЛУ, ЯКІ АДНОСІЦЦА ДА ХАРАКТАРЫСТЫКІ КАПІТАЛІЗМУ, ГЭТЫ ПРАЕКТ ДАЕ НЕ ПРАГРАМУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ, ЯКІ ЗМАГАЕЦЦА СУПРОЦЬ ВЕЛЬМІ РЭАЛЬНЫХ ПРАЯЎЛЕНЬНЯЎ ВЕЛЬМІ АКРЭСЬЛЕНАГА КАПІТАЛІЗМУ, А ПРАГРАМУ ЭКАНАМІЧНАГА ПАДРУЧНІКА, ПРЫСЬВЕЧАНАГА КАПІТАЛІЗМУ НАОГУЛ».

Па думцы Леніна, праграма павінна быць найкарацейшым выкладаньнем асноўных палажэньняў рэвалюцыйнага марксызму, і таму ўказаньне яго на тое, што праект праграмы нагадвае эканамічны падручнік, зьяўляецца надзвычай рэзкай характарыстыкай прадстаўленага Пляханавым праекту праграмы.

У трэцім пункце гэтага водгуку гаворыцца:

«НЕКАТОРЫМ ВАЖНЕЙШЫМ ПУНКТАМ НАДАНА Ў ПРАЕКЦЕ ТАКАЯ НЕДАКЛАДНАЯ ФАРМУЛЁЎКА, ЯКАЯ ЗНЯЖАЕ ПРАЛЕТАРСКІ ПАРТЫЗАНСКІ ДУХ ПРАГРАМЫ, ПАДАЕ ПАДСТАВУ ДЛЯ ПАЛІТЫЧНАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПРАГРАМЫ ЭКАНАМІЧНАГА ПАДРУЧНІКА ДЛЯ ПАЛІТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, ЯКАЯ ПРАВОДЗІЦЬ ПРАД САМЫХ НЕБЯСЬПЕЧНЫХ НЕПАРАЗУМЕНЬНЯЎ І ЗАТРУДНІЦЬ НАМ НАШУ ТЭАРЫТЫЧНУЮ БАРАЦЬБУ І ПРАПАГАНДУ».

Потым крыху далей:

«МЕСЦА «ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ» ЗАНЯЛА «РЭВАЛЮЦЫЯ, ЯКУЮ ПРАДСТАІЦЬ ЗРАБІЦЬ ПРАЛЕТАРЫЯТУ, ПАДТРЫМАНАМУ ДРУГІМІ ПЛАСТАМІ НАСЕЛЬНІЦТВА, ЯКОЕ ЦЕРПІЦЬ АД КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ ЭКСПЛЁАТАЦЫІ», І НАВАТ ЗАМЕСТ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ ПАСТАЎЛЕНА «БАРАЦЬБА ПРАЦОЎНАЙ І ЭКСПЛЁАТУЕМАЙ МАСЫ». ТАКАЯ ФАРМУЛЁЎКА СУПЯРЭЧЫЦЬ АСНОЎНАМУ ПРЫНЦЫПУ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ: «ВЫЗВАЛЕНЬНЕ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ МОЖА БЫЦЬ СПРАВАЙ ТОЛЬКІ САМОЙ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ».

Гэта ўказаньне Уладзімера Ільліча на адсутнасьць у праекце праграмы Пляханава УСПАМІНАНЬНЯ АБ ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ зьяўляецца надзвычай істотным і сьведчыць аб тэй геніяльнай празорлівасьці, якою адзначаецца Уладзімер Ільліч ужо ў тыя далёкія часы. Па гэтых наўмысна расплыўлівых фармулёўках Пляханава Уладзімер Ільліч ужо тады прадугадваў апартуністычнае падзеньне будучага меншавізму.

Далейшы шлях Пляханава даказаў, што гэта рэзкая крытыка Уладзімера Ільліча была зусім угрунтавана, бо мы ведаем, што Пляханаў у далейшым перастаў быць змагаром рэвалюцыйнага марксызму.

Далей, у чацьвертым пункце Уладзімер Ільліч піша:

Паміж Пляханавым і Леніным навісла пагроза расколу. Была выбрана камісія, якая і выпрацавала той праект, які потым быў дакладзен II зьезду партыі, як праект праграмы партыі і які быў прыняты вялізарнай большасьцю зьезду, прычым за яго галасавалі і Пляханаў, і Ленін.

Такім чынам праграма партыі была з усімі папраўкамі Леніна зацьверджана II зьездам партыі, што трэба лічыць адной з вялізарнейшых заслуг II зьезду.

Другой важнейшай падзеяй на другім зьезьдзе можна лічыць абмеркаваньне і прыняцьце арганізацыйнага статуту партыі. Пры абмеркаваньні пытаньня аб арганізацыйным статуце партыі ўпяршыню ясна вызначыліся разыходжаньні паміж самімі «іскраўцамі». Частка «іскраўцаў», якія потым сталі называцца меншавікамі, на чале з Мартавым, Патрасавым, Аксэльродам, Засуліч, Троцкім і інш., выказалася за прыняцьце першага параграфу статуту партыі ў меншавіцкай рэдакцыі Мартава. Гэта рэдакцыя, зразумела, зусім не здавальняла Ул. І. Леніна і другіх бальшавікоў.

Ленін на II зьезьдзе партыі гаварыў наступнае аб фармулёўцы Мартавым першага параграфу статуту:

«Фармулёўка Мартава ёсьць пагоршаньне першапачатковага праекту, пагоршаньне, якое можа прынесьці партыі ў пэўных умовах нямала труднасьцяй». «Фармулёўка гэта (Мартава) няўхільна імкнецца ўсіх і кожнага зрабіць членам партыі».

І далей:

«... лепш, каб дзесяткі працуючых не называлі сябе членамі партыі (сапраўдныя работнікі за чынамі ня гоняцца), чым каб адзін балбатун меў права і магчымасьць быць членам партыі. Вось прынцып, які мне здаецца неабвержны і які прымушае мяне змагацца супроць Мартава. Мне пярэчыці, што правоў членам партыі мы пініх не даем і таму зпоўжываньняў быць ся можа. Гэта пярэчаньне нягрунтоўнае. Калі ў нас ня ўказана, якія іменна асаблівыя правы атрымлівае член партыі, дык заўважце, што ў нас і ня прыведзена ніякіх указаньняў пра абмежаваньне правоў члена партыі. Гэта па-першае. А па-другое, і гэта галоўнае, незалежна нават ад правоў, нельга забываць, што ўсякі член партыі адказны за партыю і партыя адказна за ўсякага члена партыі».

Гэтым самым Ленін прад'яўляў члену партыі такія патрабаваньні, якія затрудніл-б доступ у партыю дробнабуржуазным элемэнтам. Меншавікі-ж адкрывалі ім дарогу ў партыю.

І скончыў сваю прамову Ленін наступнай прапановай:

«Наша задача — аберагаць цьвёрдасьць, вытрымліваць чыстату нашай партыі».

«Мы павінны старацца ўзьняць званьне і значэньне члена партыі вышэй, вышэй і вышэй. І таму я супроць фармулёўкі Мартава».

Гэта прамова Леніна да гэтага часу можа служыць нам кіруючым указаньнем па пытаньні аб тым, якім павінен быць сапраўдны член партыі. І таму гэта прамова можа служыць дасканалым кіраваньнем пры праходзячай зараз чыстцы нашай партыі.

Мы ведаем, аднак, што другі зьезд партыі ня прыняў першага параграфу статуту ў фармулёўцы Леніна. Фармулёўка Леніна была адхілена 28 галасамі супроць 22, прычым супроць фармулёўкі Леніна галасавалі меншавікі, аднэй з яе арганізацый, падпарадкуецца пастановам партыі і плаціць членскія ўносы».

Вялікія спрэчкі на другім зьезьдзе ўзьніклі па пытаньні аб складзе цэнтральных органаў партыі. Меншавікі прапаноўвалі ўвесьці ў рэдакцыю цэнтральнага органу партыі ўсю ранейшую рэдакцыю «Искры», тады як Ленін патрабаваў выбару тройкі ў асобе Леніна, Пляханава і Мартава. Гэта прапанова была прынята зьездам бальшавікоў 24 галасамі супроць 20, і ў адказ на гэту пастанову Мартаў заявіў, што ён адмаўляецца ўвайсьці ў такую рэдакцыю цэнтральнага органу. Такім чынам у цэнтральным органе аказаліся толькі два рэдактары — Ленін і Пляханаў.

У цэнтральны Камітэт меншавікі прапаноўвалі сьпіс, у які ўваходзілі ў большасьці іх прыхільнікі, але гэты сьпіс быў рашуча адхілен зьездам, і ў Цэнтральны Камітэт былі выбраны тры бальшавікі (Кржыжаноўскі, Ленгнік, Наскоў). Для ўзгадненьня разгалосьсяў, якія маглі ўзьніннуць паміж цэнтральным органам і Цэнтральным Камітэтам, другім зьездам быў устаноўлен асобны орган пад назвай савету партыі. Савет партыі складаўся з 5 таварышоў. Старшыня савету выбіраўся зьездам, два члены савету выбіраліся цэнтральным органам і два другія члены савету выбіраліся Цэнтральным Камітэтам.

Хутка пасьля зьезду стала зусім ясна, што сумесная работа бальшавікоў з меншавікамі зусім немагчыма. Ужо на II зьезьдзе «Замежнай лігі рэвалюцыйных сацыял - дэмакратаў», якая зьяўлялася адзінай, зацьверджанай II зьездам замежнай арганізацыяй нашай партыі, гэта немагчымасьць сумеснай работы бальшавікоў з меншавікамі намецілася зусім ясна. Большасьць членаў II зьезду «Лігі рэвалюцыйных сацыял-дэмакратаў» аказалася на баку меншавікоў, і таму на сваім II зьезьдзе гэта арганізацыя меншавікоў павяла рашучую атаку супроць устаноўленых II зьездам цэнтральных органаў партыі. Прысутны на гэтым зьезьдзе член Цэнтральнага Камітэту партыі Ленгнік павінен быў выступіць з пратэстам супроць рашэньняў гэтай партыйнай арганізацыі і, калі гэтыя пратэсты зусім ня былі прыняты пад увагу II зьездам лігі, член Цэнтральнага камітэту Ленгнік павінен быў заявіць, што ён лічыць II зьезд лігі незаконным, і запрасіў таварышоў, згодных з гэтай думкай, пакінуць гэты зьезд. У разультаце з II зьезду выйшлі ўсе прыхільнікі большасьці. Хоць гэта выступленьне члена Цэнтральнага камітэту на II зьезьдзе лігі было зроблена з поўнай згоды Леніна і Пляханава, апошні (г. зн. Пляханаў) пасьля гэтага ясна намечанага расколу паміж бальшавікамі і меншавікамі пахіснуўся.

Пляханаў заявіў Леніну, што ён лічыць неабходным зрабіць уступку меншавікоў у выглядзе кааптацыі ў цэнтральны орган партыі «Искра» Мартава і трох адхіленых зьездам рэдактароў, г. зн. Старавера, Аксэльрода і Засуліч. Ленін наадрэз адмовіўся ад такой кааптацыі і калі Пляханаў настойваў далей на неабходнасьці гэтай меры, Ленін вышаў з рэдакцыі «Искра» і прадаставіў Пляханаву паступіць так на свой уласны страх і рызыку.

Такім чынам у рэдакцыі цэнтральнага органу аказаліся Пляханаў і вышэйназваныя чацьвёрка, а фактычна гаспадаром цэнтральнага органу партыі сталі яркa выяўленыя меншавікі — Мартаў, Старавер, Засуліч і Аксэльрод. Ленін - жа быў уведзен у цэнтральны камітэт партыі і быў назначан у савет партыі, у які таксама ўваходзіў і тав. Ленгнік. Такім чынам большасьць у савеце партыі аказалася не на баку бальшавікоў. З аднаго боку — Ленін і і Ленгнік, з другога— Мартаў, Аксэльрод і Пляханаў. Цэнтральны-ж камітэт хутка таксама пахіснуўся, асабліва пасьля арышту некалькіх бальшавікоў — членаў ЦК партыі і пад націскам савету партыі ў Цэнтральны камітэт таксама былі ўведзены меншавікі. Калі саветам партыі была адкінута прапанова двух членаў бальшавікоў аб скліканьні III зьезду партыі, бальшавікі ўсё-ж парашылі ажыцьвіць скліканьне III зьезду партыі наперакор выяўленай волі савету партыі забараніўшага нават агітацыю за III зьезд.

Бальшавікі зьвярнуліся да камітэтаў і пераважная большасьць камітэтаў выказалася за неабходнасьць скліканьня III зьезду партыі, які і быў скліканы. Такім чынам III зьезд партыі зьявіўся ўжо зьездам чыста бальшавіцкім, тым больш, што меншавікі байкатавалі гэты зьезд і склікалі свой зьезд у Жэневе, які супроцьставіў сябе III зьезду партыі бальшавікоў.

Вось коратка гісторыя II зьезду партыі і падзей, якія сьледавалі за II зьездам, і мы можам зараз зусім упэўнена сказаць, што палітыка, якая праводзілася Леніным як да II зьезду, так і ў часе II зьезду і пасьля яго аказалася абсалютна правільнай і што супольная работа бальшавікоў—пралетарскіх рэвалюцыянэраў, з меншавікамі—буржуазнай агентурай сапраўды была нямэтазгоднай, непатрэбнай і немагчымай, як лічыў Ул. І. Ленін.

З таго часу мінула 30 год.

Трыццатая гадавіна II зьезду партыі павінна быць перш за ўсё і больш за ўсё выкарыстана для далейшага ўзбраеньня кожнай партарганізацыі, кожнага партыйца тэй ленінскай непрымірымасьцю да ўсіх рознавіднасьцяй апартунізму, да ўсіх праяўленьняў буржуазнага і дробна-буржуазнага ўплыву з тэй непрымірымасьцю, з якой бальшавікі на чале і пад кіраўніцтвам Леніна аберагалі чыстату партыі, яе ідэалёгічную згуртаванасьць і баздольнасьць ад меншавіцкай атруты. З 30-гадовай гісторыі партыі трэба чэрпаць вопыт барацьбы з апартуністамі ўсіх масьцей і знаходзіць у ёй адказы на хвалюючыя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва. Адсюль — кіраўніцтва да дзеяньня, ад сюль бальшавіцкая зарадка ў сёньнешней барацьбе за пабудову сацыялістычнага бясклясавага грамадзтва.

Лепшым працягвальнікам традыцый бальшавізму пасьля Леніна стаў улюбёны правадыр нашай партыі тав. Сталін, які цьвёрдай рукой праводзіць прынцыпы бальшавізму як у адносінах будаўніцтва партыі, так і непахіснай барацьбы як з правым ухілам — галоўнай небясьпекай на даным этапе, так і з «левым», выходзячы з такіх асноўных пастаноў нашай партыі, як прапанаваная Леніным пастанова X зьезду аб партыйнай дысцыпліне.

«Найстражэйшая партыйная дысцыпліна зьяўляецца найпершым абавязкам усіх членаў партыі і ўсіх партарганізацый. Пастанова партыйных цэнтраў павінна выконвацца быстра і дакладна. Разам з тым, унутры партыі абмеркаваньне ўсіх спрэчных пытаньняў партыйнага жыцьця зусім свабодна да таго часу, пакуль пастанова ня прынята. Невыкананьне пастаноў вышэйшых арганізацый і іншыя праступкі, якія прызнаюцца злачыннымі грамадзкаю думкаю партыі, цягнуць за сабой: для арганізацыі — ганьбаваньне, назначэньне часовага камітэту зьверху і агульную перарэгістрацыю (роспуск арганізацыі). Для пасобных членаў партыі — агульны від ганьбаваньня (пастаноўка на від, вымова і г. д.), публічнае ганьбаваньне, часовае адхіленьне ад адказнай партыйнай і савецкай работы, выключэньне з партыі, выключэньне з партыі з паведамленьнем аб учынку адміністрацыйным і судовым уладам».

Партыя разграміла трацкізм, які скаціўся зараз у абдымкі міжнароднай контр-рэвалюцыі і стаў яе перадавым атрадам у барацьбе супроць рабочай клясы і Савецкага саюзу.

Наша партыя разграміла і правы ўхіл, правых апартуністаў, якія зьяўляюцца агентурай кулацтва і здрадзілі інтэрэсам рабочай клясы, якая змагаецца за ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры і будаўніцтва сацыялізму.

Партыя, як і раней пад кіраўніцтвам Леніна, так і зараз, пад кіраўніцтвам ЦК на чале з тав. Сталіным, вядзе бязь літасную барацьбу на два фронты—супроць правых апартуністаў, як галоўнай небясьпекі, і супроць дробнабуржуазнай «рэвалюцыйнасьці зьлева» (аб якой Ленін у «Дзіцячай хваробе лявізны» напісаў цэлы разьдзел: «У барацьбе з кожным ворагам унутры рабочага руху вырас, умацаваўся і загартаваўся бальшавізм»).

Прынцыпы вялікага бальшавізму, на якіх будавалася наша партыя і якія па-бальшавіцку абараняюцца і праводзяцца зараз ленінскім ЦК на чале з тав. Сталіным, — зарука непераможнасьці нашай партыі. «Партыя непераможная, калі яна ведае, куды весьці справу і ці баіцца труднасьцяй» (СТАЛІН). А гэта значыць, што якія-б складаныя задачы ні стаялі перад нашай партыяй як унутры СССР, так і ва ўсім сьвеце, наша партыя на чале з ленінскім ЦК і тав. Сталіным здолее давесьці да канца вялік

„У змаганьні з ухіламі ад ленінскай лініі вырасла і ўзмацнілася наша партыя. У змаганьні з ухіламі выкавала яна сабе ленінскае адзінства сваіх радоў... Ленін казаў, што прынцыповая палітыка ёсьць адзіна правільная палітыка. Мы выйшлі пераможцамі са змаганьня з ухіламі таму, што сумленна і пасьлядоўна выконвалі гэты наказ Леніна“ (СТАЛІН)

ЯК МЫ ЗМАГАЛІСЯ ЗА БАЛЬШАВІЗМ

Усё ўзрастаючы рэвалюцыйны рух працоўных мас у Расіі ў 1902-03 г. г. надзвычай абкавіў дзейнасьць рускіх рэвалюцыянэраў за границай.

У Парыжы, як і ў іншых эміграцыйных цэнтрах, ішла арганізацыйная і ідэйная падрыхтоўка да другога зьезду партыі. На вялікіх рускіх мітынгах выступалі з дакладамі Ленін, Мартаў і інш. Апрача гэтых мітынгаў праводзіліся чыста сацыял-дэмакратычныя сходы, дзе прымалі ўдзел члены групы «Искра», «Лігі рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі», групы «Барацьба» і інш. На гэтых партыйных сходах абгаварваўся праект новай тады, цяпер старой, праграмы расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі.

Былі адзін або два яшчэ больш вузкіх сходы з удзелам тав. Леніна, дзе абгаварвалася пытаньне аб тактыцы партыі ў сувязі з буйнымі забастоўкамі і масавымі вулічнымі дэманстрацыямі рабочых, якія адбываліся ў той час у Расіі.

***

Амаль адначасова, калі ў Лёндане адбываўся другі зьезд, у Кацярынбургу (Сьвердлоўску) стварыўся Сярэдня-Уральскі камітэт расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі.

З 1901 да 1903 г. на Ўрале існавала абагнаная арганізацыя сацыял-дэмакратаў і сацыялістаў-рэвалюцыянэраў пад назвай «Уральскі саюз сацыял-дэмакратаў і сацыялістаў-рэвалюцыянэраў». «Искра», якая выдавалася тады пад кіраўніцтвам Леніна, у № 21 раскрытыкавала гэта сваяасаблівае абгаварваньне, пасьля чаго асобныя с.-д. арганізацыі парвалі сувязь з «Уральскім саюзам». Але толькі ў маі 1903 г. пасьля правалу кіруючага ядра «Уральскага саюзу» ў Кацярынбургу адбыўся поўны разрыў паміж сацыял-дэмакратамі і сацыялістамі-рэвалюцыянэрамі.

На зьезьдзе ўцалелых ад жандарскага разгрому партыйных работнікаў, які адбыўся ў жніўні 1903 году, было прынята рашэньне ліквідаваць сваяасаблівы саюз. Складам за тым з ведама і згоды АК партыі быў арганізаван «Сярэдня-Уральскі камітэт расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі». Зноў створаная арганізацыя выказала свае адносіны да іншых с.-д. органаў у наступнай заяве:

«Паводле пастановы зьезду Уральскага саюзу сацыял-дэмакратаў і сацыялістаў-рэвалюцыянэраў, гэты саюз спыніў сваё існаваньне. З ведама і згоды арганізацыйнага камітэту расійскай с.-д. рабочай партыі і пры яго падтрымцы ў рабоце Сярэдняга Уралу стварыўся Сярэдня-уральскі камітэт партыі. З гэтага зразумела, якія адносіны арганізаванага камітэту да існуючых агульна-партыйных арганізацый, да партыйнай праграмы, тактыкі і існуючых плянаў арганізацыі; ён салідарны ў сваіх поглядах з «Зарой» і «Искрой» і ў іх духу і згодна іх плану ён імкнецца ўмацаваць сваю арганізацыю, весьці прапаганду і агітацыю, каб уступіць, нарэшце, побач з іншымі камітэтамі нашай партыі ў рашучую барацьбу: 1) з усімі рэшткамі прыгонніцтва наогул, з царскім самаўладзтвам у асаблівасьці, 2) з капіталістычнай эксплёатацыяй і ўціскам—за апошнае і канчатковае вызваленьне пралетарыяту.

Новы камітэт высока цэніць рэвалюцыйную работу «Искры», яе базьлітасную крытыку, яе адважнае і пасьлядоўнае выкрыцьцё як яўных ворагаў пралетарыяту, так і мнімых прыцеляў яго (сац.-рэв.), яе настойную барацьбу супроць вольных і на вольных спроб падкапацца пад асноўныя палажэньні «артадаксальнай праграмы («Рабочее дело», «Борьба»), ён хацеў-бы бачыць «Искру» і «Зарю» агульна-прызнанымі цэнтральнымі органамі пралетарскай партыі ў Расіі. «Заграничную лігу» ён лічыць сваім прадстаўніком заграніцай і да арганізацыйнага камітэту будзе адносіцца, як да часовага Цэнтральнага Камітэту партыі.

Нехай жыве ўзмоцненая партыя пралетарыяту!

Нехай жыве пралетарскі сацыялізм!

Верасень 1903 году.

Сярэдня-Уральскі Камітэт Расійскай Сацыял-Дэмакратычнай Рабочай Партыі».

Весткі аб пастановах другога зьезду партыі дайшлі ў Кацярынбург толькі пасьля двух месяцаў з часу зьезду.

З прыведзенага вышэй дакументу відаць, што да кастрычніка 1903 году Сярэдня-Уральскі камітэт ня меў ніякіх вестак ні аб жорсткай барацьбе паміж большасьцю і меншасьцю, якая адбылася на зьезьдзе, ні аб унутры-партыйнай барацьбе пасьля II зьезду і ролі ў ёй «Заграничнай лігі рускіх рэвалюцыйных сацыял-дэмакратаў». Але калі да нас дайшлі весткі аб парушэньні пастаноў другога зьезду меншасьцю, аб выхадзе Леніна са складу рэдакцыі «Искры» і пераходзе ЦО да меншасьці (меншавікоў), Сярэдня-Уральскі камітэт пажадаў у ЦО ліст-пратэст, узгадніўшы яго перад гэтым з Пермскім і Уфімскім камітэтамі партыі.

У гэтым лісьце гэтыя тры партарганізацыі выказваюць пратэст супроць выхаду Леніна з рэдакцыі і супроць парушэньня пастаноў II зьезду меншасьцю, якая, дзякуючы пераходу да іх Пляханава, аказалася ў большасьці (Пляханаў і Мартаў супроць Леніна) у рэдакцыі «Искры». Мы выкрываем у гэтым лісьце новы курс «Искры», указваем на прыміўнічыя, мяралёбныя адносіны новай «Искры» да рэвізіяністаў, апартуністаў і эканамістаў, указваем на тое, што рускія эканамісты, хвасьцісты, уваскоўшыя цяпер у партыю, ня лепш нямецкіх рэвізіяністаў, што эканамісты ўвайшлі ў партыю, каб зламаць яе з сярэдзіны і г. д.

Надрукаваўшы ліст Уфімскага, Сярэдня-Уральскага і Пермскага камітэтаў у новай «Искры», Пляханаў суправаджае яго едкай крытыкай няўдала памі прывядзенага прыкладу в гісторыі германскай рэвалюцыі 1848 г. і памыловага зьмяшэньня намі рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі з рэвалюцыйнай інтэлігенцыяй. Асноўныя жа пытаньні, пастаўленых у гэтым лісьце, Пляханаў не закранае зусім, абмяжоўваючы вярнуцца да іх у наступным нумары «Искры».

Пратэст уральскіх арганізацый закрануў не аднаго Пляханава, але і лічыўшага сябе рэвалюцыйным сацыял-дэмакратам Троцкага, перайшоўшага пасьля другога зьезду да меншавікоў. У сваёй кніжцы «Тактычныя задачы, арганізацыйнае пытаньне, якобінізм і сацыял-дэмакратыя», стар. 69, ён піша:

«Партыйная дысцыпліна — адзін з самых баявых лёзунгаў у «большасьці». Вельмі шкада, што дзя чалавецтва безнадзейна загінулі ўсе тыя разважаньні аб дысцыпліне, якіх нам, членам так званай «меншасьці» давалося наслухацца раней, чым пытаньне вышла з парадку дня. Хіба толькі ў драмучых лясох Уралу або ў пэтрах сібірскай тайгі сёньня сустрэнеш прад стаўнікоў шляхетнай, але выміраючай расы «цывёрдых іскраўцаў» першага закліку, «якабінцаў чыстых, як сонечны прамень». Зразумела, разлагаючы дух крытыкі і сумненьня дабраецца і да іх. Але яны мужна змагаюцца супроць яго, стараючыся адкінуць яго на захад Уралу і выратаваць, такім чынам, сацыял-дэмакратычную Азію, кіруемую сваяцкім мне сібірскім саюзам. Зразумела, усе гэтыя намаганьні асуджаны гісторыяй загадзя, але самі гераічныя ўральцы мімаволі ўпушчаюць да сябе павагу сваёй пасьлядоўнасьцю і сваёй мужнасьцю. За гэтыя іх якасьці будучы гісторык нашай партыі выратуе іх ад забыцьця: ён прысьвяціць некалькі радкоў іх «маніфэсту», у якім адважна і чэсна фармулявана пазыцыя «большасьці».

Прадраканьні Троцкага ня збыліся: усе яго намаганьні зьвярнуць партыю з ленінскага шляху на шлях апартуністычнага і авантурызму былі «асуджаны гісторыяй загадзя». Перабягаючы ня раз ад бальшавікоў да меншавікоў і назад, Троцкі скопыў сваю «рэвалюцыйную» кар'еру ў чыне лідэра пераважна апраду буржуазнай контр-рэвалюцыі. Ленінскія-ж арганізацыйныя прынцыпы, якія мы, юныя бальшавікі, тады абаранялі, прывялі партыю да перамогі ў Кастрычніку, на франтох грамадзянскай вайны і да бліскучай перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

С. ЗАЛКІНД.

ЗНАЧЭНЬНЕ ДРУГОГА ПАРТЗЬЕЗДУ

Памятаю пасьля скончэньня зьезду ўсе бальшавікі, нас было тады 20 чалавек, на прапанове Уладзімера Ільліча адправіліся ў Лёндан на магілу Карла Маркса. Гэтым мы запрэцілі, так сказаць, афармленьне нашай бальшавіцкай фракцыі. Уладзімер Ільліч пастраёдзіў нас загадзя: «Будзьце ўпэўнены, ніхто тут ня ведае магілы Маркса». Ён меў рацыю. Вартаўнікі нам адказалі, што містэр Маркс настолькі невядомы, магіла яго так рэдка наведваецца, што яны шкадуюць яе ня могуць. Зразумела, Уладзімер Ільліч добра ведаў, дзе магіла, але ён хацеў гэтым падкрэсьліць, наколькі забыт Маркс рабочым рухам перадавых краін. Нас ахапіў выгляд гэтай запушчанай магілы з разьбітай плітой з яўнымі сьлядамі закінутасьці. На магіле Маркса мы зразумелі, што наша бальшавіцкая фракцыя заклікана поўнасьцю адпавіць рэвалюцыйнае вучэньне Маркса, аднавіць у масах памяць аб ім.

Невыпадкова, што на другім зьезьдзе мы пашкі іменна за Уладзімерам Ільлічом, а не за больш вядомымі тады кіраўнікамі с.-д. Пляханавым і Аксэльродам. Трэба сказаць, што большасьць з нас ведала Леніна толькі як аўтара «Што рабіць?» (артыкулы Леніна ў «Искре» былі большай часткай без подпісу). Фракцыя бальшавікоў на другім зьезьдзе складалася амаль выключна з мясцовых работнікаў, а ва фракцыі меншавікоў мы бачым выключна літаратараў і цэнтральных работнікаў. Ва ўсіх мясцовых работнікаў было вялікае імкненьне пакончыць з раздробленасьцю і гуртковшчынай, існаваўшымі тады ў партыі і стварыць моцную цэнтралізаваную арганізацыю. Адсутнасьць цэнтральнага кіраўніцтва, адсутнасьць праграмы і статуту партыі вельмі перашкаджала на кожным кроку. Вельмі адчувалася патрэба стварыць вытрыманую адзінамыслячую партыю, якая магла-б сапраўды кіраваць рабочым рухам.

Усюды ўжо нарастала хваля стачак, прайшла цэлая хваля дэманстрацый, быў рад крывавых сутычак у Пецеры, Растове, Златавусьце, дзе было расстраляна некалькі дзесяткаў і параненa некалькі сотень дэманстрантаў. Усюды маса выходзіла на вуліцу з патрабаваньнем: «далоў самаўладзтва». І вось, калі перад другім зьездам выйшла кніга Леніна «Што рабіць?», дзе было пастаўлена ва ўвесь рост арганізацыйнае пытаньне, усе мясцовыя сур'ёзныя работнікі віталі ленінскі шлях стварэньня клясавай баявой партыі.

Для нас, радавых членаў партыі, спрэчкі па 1 параграфе статуту былі зусім ясныя, мы, масавікі, адразу ўлічылі практычнае значэньне фармулёўкі Леніна, які абараняў стварэньне жалезнай партыйнай дысцыпліны, дзе кожны член партыі адказвае за ўсю партыю і партыя адказвае за кожнага члена.

Партыя ня можа быць распыўлівай, як малявалі сабе меншавікі, якія прапаноўвалі шырока адчыніць дзьверы партыі ўсім непралетарскім, апартуністычным элементам. Баявая клясавая партыя можа лічыць сваім членам толькі таго, хто зусім ясна разумее і прымае праграму і статут партыі, хто актыўна працуе ў тэй ці іншай партыйнай арганізацыі (ячэйцы). Баявая партыя павінна ўключаць у сябе толькі найлепшых, найбольш сьвядомых і актыўных авангард рабочай клясы.

Калі пасьля 2-га зьезду нашы спрэчкі ўсталі ўжо перад тварам міжнароднай сацыял-дэмакратыі, яна рэзка адмоўна аднеслася да бальшавікоў, асабліва да Уладзімера Ільліча. Ці выпадкова, што II Інтэрнацыянал і нават яго «левыя» найбольш рэвалюцыйныя элементы, якія ў сябе адхрышчваліся ад апартунізму, — адразу сталі на пазыцыю меншавікоў супроць нас? Не, гэта невыпадкова. Тое новае, што ўнёс Уладзімер Ільліч у арганізацыйнае будаўніцтва партыі, было ня толькі супроць расійскіх меншавікоў, яно было супроць усёй прыстасаванскай тактыкі II Інтэрнацыяналу.

У акцэнтаваньні арганізацыйнага пляну Леніна яны адчулі адразу папрозу свайму аўтарытэту. На словах яны змагаліся супроць рэвізіяністаў, а на справе праводзілі тое, да чаго заклікаў Бернштэйн, Фольмар і іншыя рэвізіяністы. Вось чаму яны адчулі небясьпеку ў ленінскай пастаноўцы пытаньня і ўсе сталі на бок меншавікоў.

Разыходжаньні паміж Леніным і Пляханавым яшчэ да зьезду зводзіліся да таго, што Пляханаў і астатнія меншавікі, пры поўным падтрыманьні II Інтэрнацыяналу, маляваці сабе карціну далейшага разьвіцьця Расіі зусім таксама як яно ішло ў перадавых краінах, у Германіі, Францыі і г. д.

Ня толькі для Уладзімера Ільліча з самага пачатку, але і для ўсіх нас, якія ішлі разам з ім, было ясна, што ў нас у Расіі іншага шляху, апрача рэвалюцыйнага дыктатуры пралетарыяту, ня можа быць. Ільліч гэта ясна разумеў і таму ён настойваў на тым, каб у праграме і статуце асобна падкрэсьлівалася пытаньне аб клясавым характары партыі. Пляханаў прабаваў увесьці ў праграму, што задача с.-д. партыі — выказваць інтарэсы **ўсіх** прычнечаных, **усіх** эксплёатуемых, **усіх** працоўных. Уладзімер Ільліч розка пратэстуе супроць такой пастаноўкі, ён патрабуе яснай фармулёўкі: клясавай пралетарскай партыі, якая процістаіць усім буржуазным і дробна-буржуазным партыям. Толькі пры дапамозе такой партыі можна кіраваць рухам усёй рабочай масы і павесьці за сабой усю астатнюю масу эксплёатуемых і прычнечаных. Партыя, якую будаваў Ленін, — **гэта партыя клясавая, а ня партыя ўсіх працоўных**, бо без гэтай клясавай партыі нельга кіраваць рэвалюцыяй, нельга зрабіць пралетарыят гегемонам рэвалюцыі.

30 год таму назад непрымірымасьць, праяўленая Леніным, дала яму магчымасьць стварыць наперакор меншавікому і II Інтэрнацыяналу тую партыю, якая ажыцьцявіла Кастрычніцкую рэвалюцыю, перамагла ў грамадзянскай вайне і цяпер з посьпехам будуе сацыялізм на адной шостай зямлі. На спрэчках, якія пачаліся на 2-м зьезьдзе, пачаў выкоўвацца той вопыт, які выкарыстан быў у рэвалюцыі нашай партыі. На аснове гэтага з бальшавіцкага вопыту ішло і будаўніцтва Камінтэрну, ідзе і будаўніцтва брацкіх кампартый. Укараненьне пашага вопыту, аснова якога была закладзена на 2 зьезьдзе, усваеньне нашага арганізацыйнага будаўніцтва зьяўляецца неабходнай умовай бальшавізацыі камуністычных партый, неабходнай умовай ператварэньня іх у сапраўдныя, баяздольныя, гатовыя да сапраўдных клясавай барацьбы. Таксама, як было ясна 30 год назад для нас, бальшавікоў, што ў нас іншага шляху, апрача рэвалюцыі, няма, каб паколькі ў самаўладзтвам і з буржуазіяй, таксама становіцца ясным і для сусьветнага пралетарыяту, што для яго няма іншага шляху, апрача рэвалюцыі.

Падводзячы вынікі 30-годзьдзю, якое прайшло з 2 зьезду, параўноўваючы тую эпоху з эпохай вялікіх нашых задач па будаўніцтве сацыялізму, мы можам ацаніць усё прынцыповае значэньне барацьбы, якая адбывалася на 2 зьезьдзе.

У бліжэйшы час там, на Захадзе, працецьпець рэвалюцыйныя бані, а мы тут, у сябе, рэшы французкае будаўніцтва, стварылі ўжо прадзьвер'е бясклясавага грамадзтва. Ці можам мы адмаўляцца ад тых прынцыпаў, якія абараніліся на 2 зьезьдзе? Не, гэтыя прынцыпы дзейсны і зараз мы ня можам адмовіцца ад іх. Тая-ж моцная пагрыйная дысцыпліна, тая-ж выпрабаванасьць і праверанасьць кожнага члена партыі — гэта неабходнейшыя ўмовы для таго, каб завяршыць выкананьне тых працыёзных задач, якія стаяць перад намі.

І тое, што мы зараз пераживаем, праводзячы чыстку нашых радоў, — гэта ёсьць ажыцьцяўленьне тых-жа прынцыпаў, тых-жа задач, якія ставіў калісьці Уладзімер Ільліч на 2 зьезьдзе аб чыстаце партыі, аб членстве партыі, гаворачы, што ў радох партыі можа быць толькі перадавы найбольш сьвядомы авангард рабочай клясы, а ня ўсякі жадаючы. Раней члены нашай партыі правяраліся турмой і ссылкай, а цяпер нам прыходзіцца час-ад-часу наладжваць чысткі. Зараз у Германіі, нарыклад, чыстка непатрэбна, там Гітлер праводзіць «чыстку», там усе слабыя, усе баязьліўцы, усе апартуністы самі ўцякаюць з партыі. У нашых умовах чыстка нашай партыі нас «правяраў» Сталін, прымушаючы выходзіць з партыі ўсіх хісткіх. Цяпер у нас іншае становішча: наша партыя напоўнена партыя, у якую імкнуцца ўвайсьці клясавыя ворагі, таму тым больш сэрэзным павінен быць нагляд за складам нашай партыі. Мы працягваем быць баявой партыяй, уся наша цяперашняя работа — прыцяг нашай старой баявой работы, а таму мы павінны ўтрымаць стойкасьць нашых радоў. Уся наша работа, усё, што робіць наша партыя ў сучасны момант пад кіраўніцтвам тав. Сталіна і нашага ЦК, — гэта ёсьць працяг тых-жа баявых задач, якія мы намецілі і абаранілі на 2 зьезьдзе партыі, якія мы праводзілі ў 1917 г., якія мы працягвалі ў грамадзянскую вайну і ў барацьбе з разрухай і якія мы праводзім у сацыялістычным будаўніцтве. Толькі з гэтымі-ж прынцыпамі мы завершым сусьветны Каспрычнік.

М. Н. Лядаў.

АБ ПЕРШЫМ ПАРАГРАФЕ СТАТУТУ НАШАЙ ПАРТЫІ

(Канец. Пачатак гл. у № 165).

Падкрэсьліваючы, якое вялізарнае зло нясе для партыі права шырокага доступу ўсім у рады яе членаў, якую «цэмру блытаніны і шкоды» прабуе ўзаконіць фармулёўка меншавікоў, Ленін указваў:

«Іменна гэтага якраз і ня хочам мы! Іменна таму мы і паўстаем так рашуча супроць фармулёўкі Мартава. Лепш, каб дзесяць працуючых не называлі сябе членамі партыі (сапраўдныя работнікі за чынамі ня гоняцца!), чым каб адзін балбатун меў права і магчымасьць быць членам партыі» [1]).

І ў сувязі з гэтым аб высокай годнасьці члена партыі Ленін тады гаварыў:

«Усякі член партыі адказны за партыю і **партыя адказна за ўсякага члена...** Мы павінны старацца ўзьняць годнасьць і значэньне члена партыі вышэй, вышэй і вышэй» [2])

Так абстаяла з барацьбой за бальшавіцкі статут партыі і яго § 1 да і на самым II зьезьдзе, на якім прынята была меншавіцкая фармулёўка параграфу першага статуту, дзякуючы таму, што спачатку на зьезьдзе была большасьць апартуністаў і толькі пасьля ўходу са зьезду часткі апартуністаў стварылася большасьць на баку бальшавікоў. Але гэтым справа далёка ня скончылася. Праводзячы і пасьля II зьезду пястомную барацьбу, Ленін прысьвячае гэтаму свае спэцыяльныя брашуры, артыкулы, прамовы, у якіх бічуе ўсякія спробы, тармозячыя справу перамогі бальшавіцкага статуту партыі, асабліва § 1, як найбольш важнага ў той час для арганізацыі партыі. У асобным разьдзеле «Параграф першы статуту партыі» сваёй надзвычайнай кніжкі «Крок наперад, два крокі назад» Уладзімер Ільліч пісаў:

«Формула тав. Мартава або застанецца мёртвай літарай, пустой фразай, або яна прынясе карысьць галоўным чынам і амаль выключна **«інтэлігентам, наскрозь прасякнутым буржуазным індывідуалізмам» і не жадаючым** уваходзіць у арганізацыю. **На словах** формула Мартава абараняе інтарэсы шырокіх пластоў пралетарыяту; **на спразе** гэта формула паслужыць інтарэсам **буржуазнай інтэлігенцыі,** якая цураецца пралетарскай дысцыпліны і арганізацыі. Ніхто не адважыцца адмаўляць, што **інтэлігенцыя, як асобны пласт** сучасных капіталістычных грамадзтваў, характарызуецца ў агульным і цэлым **іменна індывідуалізмам** і нездольнасьцю да дысцыпліны і арганізацыі»... [3])

І тут-жа ўсёй гэтай школьнай для партыі «нездольнасьці да дысцыпліны і арганізацыі» даецца марксыцка-ленінскі аналіз:

«У гэтым, між іншым, заключаецца невыгоднае адрозьненьне гэтага грамадзкага пласта ад пралетарыяту; у гэтым заключаецца адно з [illegible] індывідуалістычнай дружлясьці і нястойлівасьці, якая так часта дае сябе адчуваць пралетарыяту; і гэта ўласьцівасьць інтэлігенцыі стаіць у непарыўнай сувязі са звычайнымі ўмовамі яе жыцьця, умовамі яе заработку, якія набліжаюцца ў вельмі і вельмі многім да ўмоў **дробна-буржуазнага існаваньня** (работа ў адзіночку або ў вельмі дробных калектывах і г. д.). Не выпадковасьць, нарэшце, і тое, што іменна на абаронцы формулы т. Мартава, павінны былі высунуць прыклады прафэсароў і пімназістаў. Не паборнікі шырокай пралетарскай барацьбы выступілі ў спрэчках аб § 1 супроць наборнікаў радыкальна—змоўніцкай арганізацыі, як думалі т. т. Мартаў і Аксэльрод, а прыхільнікі **буржуазна-інтэлігенцкага індывідуалізму сутыкнуліся з прыхільнікамі пралетарскай арганізацыі і дысцыпліны».** [1]).

Адсюль яшчэ ярчэй відаць вялізарнае значэньне барацьбы вакол § 1 статуту партыі. Адсюль ясна відаць, што барацьба ішла ня проста за фармулёўкі і акрэсьленьні, а за арганізацыю і стварэньне партыі пралетарскай сацыялістычнай рэвалюцыі, за наладжаньне яе партыйнага жыцьця, за самы характар і тып партыі, моцнай і адольнай як авангард узначаліць сваім кіраўніцтвам клясавыя бойкі пралетарыяту за камунізм. У барацьбе вакол § 1 статуту партыі сталкнуліся два розныя [illegible] Ленін на чале бальшавікоў як [illegible] ных рэвалюцыйна-марксыцкіх «прыхільнікаў пралетарскай арганізацыі і дысцыпліны» і Мартаў—Троцкі на чале меншавікоў, як апартуністычных «прыхільнікаў буржуазна-інтэлігенцкага індывідуалізму».

Тав. **Сталін** гэту барацьбу вобразна і коратка абмалёўваў у наступных словах:

«Сваёй фармулёўкай аб членстве ў партыі бальшавікі хацелі стварыць арганізацыйную вузду супроць наплыву непралетарскіх элемэнтаў у партыю. Небясьпека такога наплыву была тады больш чым рэальная з прычыны буржуазна-дэмакратычнага характару рускай рэвалюцыі». [2])

Відома, што гэта бальшавіцкая **«арганізацыйная вузда»,** ленінскі § 1 статуту партыі, аднадушна прынята на III зьезьдзе партыі, вышаў слаўным пераможцам з шматгадовай упартай барацьбы з апартуністамі, меншавікамі, трацкістамі, якія скаціліся ў лягер адкрытых клясавых ворагаў пралетарыяту і ператварыліся ў перадавы атрад контр-рэвалюцыйнай буржуазіі. Ва дома таксама, што на ўсім працягу партыйнай гісторыі меншавікі ўсіх масьцей, апазыцыянэры розных фармацый, асабліва контр-рэвалюцыйныя трацкісты, каменева-зіноўева-трацкісцкі блёк і правыя апартуністы ня раз працятвалі свае гнусныя антыленінскія спробы парушыць, узарваць і адкінуць са сваёй дарогі ленінскія арганізацыйныя прынцыпы бальшавізму. Але ўсе падобныя вылазкі аказаліся асуджанымі на поўную няўдачу і правал, а іх удзельнікі, пацярпеўшы ганебнае паражэньне, аказаліся нашчэнт разьбітымі. Нікому: ні контр-рэвалюцыйным трацкістам, ні скакаўшым пад іх дудку разлажэўшымся дэзэртырам Кастрычніка — Зіноўеву і Каменеву, ні праваму апартуністу на чале з Бухарыным, Рыкавым і Томскім, ні права-«леваму» антыпартыйнаму блёку не ўдалося і ніколі нікому ня ўдасца ні на адну яту паліхоўць несакрушальных і непахісных цьвярдынь бальшавізму, непераможны сталёвы **моналіт—УсеКП(б).**

Ленінская партыя, партыя рэвалюцыйнага дзеяньня, заваявала вялізарнейшыя гістарычныя перамогі ў клясавай барацьбе за [illegible] таму, што яна была ўзброєна правільнай тэорыяй і палітыкай, была арганізавана і выхавана на аснове пралетарскай арганізацыі і жалезнай дысцыпліны, была заўсёды акружана давер'ем і ўдзелам мільённых беспартыйных мас і змагалася пад кіраўніцтвам такіх геніяльных, прорлівых правадыроў, як Ленін і Сталін. І ў гэтых перамогах ганаровае месца 1 буйнейшыя заслугі належаць бальшавіцкаму арганізацыйнаму статуту партыі 1 яго першаму параграфу.

Аднак, было-б вельмі няправільным думаць, што быццам у сучасны момант у якой-небудзь меры зьмяншаецца роля статуту партыі і яго першага параграфу, патрабуючага ад члена партыі актыўнай работы ў адной з арганізацый партыі, патрабуючага жалезнай дысцыпліны. Гэта абсалютна няправільна. Наадварот, іменна зараз, у эпоху разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце і барацьбы за другую пяцігодку, пяцігодку пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, патрабуюцца максымальнае ўмацаваньне партыі, далейшае павышэньне ідэйнага ўзроўню яе членаў, жалезная дысцыпліна ў радох партыі, узмацненьне партыйнага кіраўніцтва ўсімі арганізацыямі пралетарскай дыктатуры і будаўніцтвам сацыялізму. Як ніколі, ад усякага члена і кандыдата партыі патрабуецца падначаленьне ўсім яе пастановам і іх дзейснае, актыўнейшае выкананьне. Як ніколі, патрабуецца абарона праграмы нашай партыі, яе статуту і пастаноў, актыўная барацьба за іх правядзьцьцьц

СУСТРЭЦЬ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ!

ДА ЗЬЕЗДУ ЗАГ. РАЙАНА

1-га верасьня пачынаецца новы навучальны год. Маючы вялікія дасягненьні ў разгортваньні ўсеагульнага абавязковага палітэхнічнага навучаньня, што зьяўляецца «ВЯЛІЗАРНАЙ ПЕРАМОГАЙ ЯК ТОЛЬКІ НА КУЛЬТУРНЫМ, АЛЕ І НА ПАЛІТЫЧНЫМ І ГАСПАДАРЧЫМ ФРАНТОХ» (СТАЛІН), надыходзячы навучальны год павінен забясьпечыць новы размах культурнай рэвалюцыі, не АСНОЎНАГА ЗЬВЯНА — палітэхнічнай школы.

Цэнтральны Камітэт нашай партыі ў сваіх пастановах аб школе даў разгорнутую праграму дасяжнай па ўзьняцьці якасьці работы школ. Ня гледзячы на значнае паляпшэньне работы школ, «карэнны недахоп» апошніх яшчэ далёка не ліквідаваны. Адсюль а асаблівай вострасьцю паўстае задача самай рашучай барацьбы за рэалізацыю пастаноў ЦК у надыходзячым навучальным годзе.

Посьпех навучальнага году залежыць у першую чаргу ад тэмпаў і якасьці яго падрыхтоўкі, ад таго, як будзе праведзена работа па ўмацаваньні навучальнай і матар'яльна-гаспадарчай базы школы (выпуск стабільных падручнікаў, праграм, будаўніцтва і абсталяваньне школы, мабілізацыя сродкаў, клопаты аб адпачынку настаўніка, аб павышэньні яго кваліфікацыі, падрыхтоўка новых пэдагагічных кадраў).

Посьпех навучальнага году будзе забясьпечан тады, «КАЛІ СПРАВА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ЎСЕАГУЛЬНАГА НАВУЧАНЬНЯ ПЕРАТВОРЫЦЦА Ў МАСАВУЮ, ГРАМАДЗКА - ПАЛІТЫЧНУЮ КАМПАНІЮ, ЯКАЯ АПІРАЕЦЦА НА ІНІЦЫЯТЫВУ І САМАДЗЕЙНАСЬЦЬ УСЁЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ» (з пастановы ЦК УсеКП(б) аб усеагульным навучаньні).

Гэтага мы яшчэ не дабіліся. Да пачатку навучальнага году застаўся ўсяго адзін месяц, а мы яшчэ НЯ МАЕМ БАЯЗЫХ ТЭМПАЎ падрыхтоўкі на мясцох.

Асабліва гэта адносіцца да такога рашаючага вучастку, як будаўніцтва і рамонт школ. У мінулым 1932 годзе праграма будаўніцтва была выканана ўсяго на 41 проц. Адпушчаныя дзяржаўныя сродкі ня былі на мясцох скарыстаны поўнасьцю. Такія раёны, як ЧАВУСКІ, ЛОЕЎСКІ, МАЗЫРСКІ не асвоілі нават і 50 проц. бюджэтных асыгнаваньняў.

Да новага навучальнага году патрэбна скончыць будаўніцтва 282 будынкаў для 4-хкамплектных школ і 112 для сямігодак. Адбудавана і адраманТавана на сёньняшні дзень мізэрная колькасьць.

Чаму? Таму што да гэтай важнейшай справы на мясцох існуюць злачынныя спартуністычныя адносіны, якія дзе-ні-дзе мяжуюцца са шкодніцтвам (Віцебск, будаўніцтва 29 ФЗС).

ДЛЯ СТАРА-ДАРОСКАГА РВК усё яшчэ неабавязкова пастанова СНК БССР па іх дакладу 12-V—1932 году. Там будаўніцтва школ сарвана ня толькі ў мінулым два гады, але і ў гэтым годзе.

У КРЫЧАЎСКІМ РАЁНЕ з 4-х школ ні адна ня будуецца. Тое-ж самае і ва ЎРАРАВІЦКІМ, ПЯТРЫКОЎСКІМ, ДУБРОВЕНСКІМ І МАЗЫРСКІМ РАЁНАХ.

Апраўданьне сваёй злачынной бязьдзейнасьці работнікі раёну прабуюць шукаць у «аб'ектыўных прычынах», у адсутнасьці матар'ялу і г. д. Гэтыя апартуністычныя разважныя настроі разбураюцца тым, што ўсе заяўкі на пясны матар'ял, на цэгну задаволены поўнасьцю ня толькі разнаралкамі, а і самым матар'ялам. Поўнасьцю забясьпечана школьнае будаўніцтва цэглай, вапнай і інш. Чым растлумачыць той факт, што ў ВУЗЬДЗЕНСКІМ РАЁНЕ, дзе ўмовы нічым не адрозьніваюцца ад іншых, усе школы на сёньнешні дзень амаль гатовы да пачатку заняткаў? Выключна тым, што БАЛЬШАВІКІ ВУЗЬДЗЕНШЧЫНЫ ПРАВІЛЬНА ЗРАЗУМЕЛІ ПАСТАНОВУ ЦК ПАРТЫІ АБ ШКОЛЕ, НЕ Ў ДЭКЛЯРАЦЫЯХ, А НА СПРАВЕ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ІХ РЭАЛІЗАЦЫЮ.

Дрэнна стаіць справа са свачасовым забясьпячэньнем школ апалам. Асабліва злачынная безадказнасьць у адносінах да школы праяўляецца зараз у справе свачасовай выкупкі і давяраньня стабільных падручнікаў да школ. З 100 падручнікаў вышла 37, але і тыя яшчэ не дайшлі да школ. СА 125 ШКОЛ МАГІЛЕЎСКАГА РАЁНУ ЎСЯГО 5 АТРЫМАЛІ ПАДРУЧНІКІ. Дагэтуль Гомельскі гарсавет поўнасьцю ня выплаціў грошай за падручнікі ў той час як СНК абавязаў усе РВК у другім і трэцім кварталах цалкам выплаціць усю суму па гадавым бюджэце на набыцьцё падручнікаў. Амаль такім малюнак мы маем у ДРЫСЕНСКІМ РАЁНЕ, дзе з атрыманых 6 падручнікаў на 1.000 рублёў ня выкуплен ні адзін. Не адстаюць у гэтым напрамку і СЕНЬНЕНСКІ, ЗАСЛАЎСКІ і РАГАЧОЎСКІ РАЁНЫ. Тут патрэбны самыя суровыя меры ў адносінах тых, якія злосна зрываюць давядзеньне стабільных падручнікаў да школ.

Няма бальшавіцкай работы на мясцох і ў пытаньнях свачасовага забясьпячэньня школ пісьмовымі прыладамі. Недапушчальнае становішча з укамплектаваньнем школ настаўнікамі. Курсы па падрыхтоўцы пэдагогаў праводзяцца не арганізавана, самацёкам.

Такія абураючыя адносіны да школ нішто іншае як адлюстраваньне спадчыны старога кіраўніцтва. ПРЫЧЫНЫ ПРАРЫВУ Ў СПРАВЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ — У ТЫХ КАНЦЫЛЯРСКІХ, БЮРАКРАТЫЧНЫХ, САНОЎНА-ПАНСКІХ МЭТАДАХ КІРАЎНІЦТВА, ЯКОЕ МЫ ЯШЧЭ МАЕМ У ОРГАНАХ НАРАСЬВЕТЫ.

У такі напружаны момант будаўніцтва, рамонту, забясьпячэньня абсталяваньнем, падручнікамі школ ня многіх раёнах ЗАГАДЧЫКІ ШКОЛАМІ АКАЗАЛІСЯ... У АДПАЧЫНКУ. Якая-жа цана тым дырэктывам райана, прысланым у школы, калі іх нама каму выконваць.

Райана дагэтуль дасканала і вычарпальна ня ведаюць становішча школ, чаго кожнай школе не хапае ў сэнсе будаўніцтва, абсталяваньня і г. д. Між тым, ВЕДАЦЬ ШКОЛУ ГЭТА ПЕРШАЯ І ЗУСІМ НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА КАНКРЭТНАГА КІРАЎНІЦТВА.

Не падхоплена і тая ініцыятыва шырокіх мас калгасьнікаў, рабочых, якія ўзяліся дапамагаць школе. Мы маем добры ПАЧЫН ДЭЛЕГАТАЎ 2-ГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ, якія ўзялі на сябе канкрэтныя абавязкі, уключыўшыся ва ўсесаюзны агляд падрыхтоўкі навучальнага году. Мы маем ініцыятыву рабочых ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, якія ўзяліся ўзорна дапамагаць сваёй падшэфнай школе ў справе ўзьнясьцця якасьці палітэхнічнага навучаньня. Хто падхапіў гэты добры пачын. Ніхто, акрамя зльводаўцаў, заводу «Полымя рэвалюцыі».

Раённыя арганізацыі прайшлі міма адозвы дэлегатаў усебепарускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. ЦП саюзу мэталяпрамысловасьці не зрабіла пачын варашылаўцаў здабыткам усіх прадпрыемстваў. Наогул на ўсесаюзным агляде падрыхтоўкі да навучальнага году НЯ ЧУЦЕН ГОЛАС ПРАФСАЮЗАЎ. Уключэньне ЦСПСБ ва ўсесаюзны агляд пакуль абмежавалася фармальным прыняцьцем пастановы.

ЗА ЎСЕ ПРАРЫВЫ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА НАВУЧАЛНАГА ГОДУ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ АДКАЗВАЮЦЬ ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ.

Да самай суровай партыйнай адказнасьці трэба прыцягнуць усіх тых, хто сабатуе пастановы ЦК партыі аб школе.

Неадкладна, зараз-жа трэба правесьці па раёнах і школах ход падрыхтоўкі да навучальнага году, забясьпечыць усім неабходным свачасовае будаўніцтва і рамонт школ, забясьпячэнь не апошніх стабільнымі падручнікамі, праграмамі, навучальнымі прыладамі, расставіць правільна настаўніцкія сілы, забясьпечыць мэтадычную падрыхтоўку да заняткаў — галавы задачы.

Неабходна зараз-жа прымацаваць адказных асобных работнікаў да пэўных сельсаветаў, школ, якія-б адказвалі за падрыхтоўку школ да заняткаў. Неабходна выдзеліць адстаючыя раёны, сельсаветы, школы з тым, каб дасканала вывучыўшы прычыны адставаньня, выправіць недахопы на-хаду. Неабходна ўзяць пад асобны нагляд школы нацыянальных меншасьцей, школы буйных заводаў, МТС, калгасаў і саўгасаў, на новабудоўлях. Трэба падхапіць тую ініцыятыву мас калгасьнікаў і рабочых, якую мы маем зараз у справе дапамогі школе.

Школы БССР, органы нарасьветы ўключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва з Заходняй вобласьцю на лепшую падрыхтоўку да навучальнага году.

Задача заключаецца ў тым, каб на зводзіць кіраўніцтва гэтай справай да дачы агульных дырэктыў і шматлікіх загадаў. «Галоўнае кіраўніцтва цяпер заключаецца ў фактычнай штодзённай праверцы выкананьня дырэктыў і загадаў на месцы».

Гэтае ўказаньне ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб рабоце чыгуначнага транспарту цалкам адносіцца і да кіраўніцтва справай народнай асьветы.

Кожны камітэт партыі, кожны выканком, фабком, праўленьне калгасу і саўгасу павінны абмеркаваць у сябе падрыхтоўку сваіх школ да новага навучальнага году, аказаць ім неабходную практычную дапамогу, праверыць затым выкананьне сваіх дырэктыў.

«Справа гонару, адвагі і геройства ўсіх работнікаў школы настолькі ўзорна падрыхтаваць новы навучальны год, каб забясьпечыць савецкай палітэхнічнай школе ўмовы для магчымасьці новага ўздыму ў адпаведнасьці з вялізарнымі тэмпамі разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва і вырасшымі культурнымі запатрабаваньнямі мас рабочых і калгасьнікаў» (ЗУБНОЎ).

1-га жніўня—усебеларускі чырвоны абоз са збожжам

УСЕ СІЛЫ НА КАСЬБУ І УБОРКУ СЕНАЖАЦЯЙ, НА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ СЕНАЗАГАТОВАК

РАЎНЯЦЦА ПА КАЛГАСАХ ПУХАВІЦКАЙ, РАГАЧОЎСКАЙ І АРШАНСКАЙ МТС!

30 ліпеня

Апошняя зводка аб ходзе сенаўборкі па БССР з усёй відавочнасьцю паказвае, што рад раёнаў вядуць гэту адказьнейшую кампанію злачынна марудным тэмпамі. У рэзультаце нас абагнала За ходняя вобласьць, а ўборка ў БССР яшчэ ня скончана і зацягнулася да пачатку жніва. Перад намі рэальная пагроза зрыву ўборкі другога ўкосу, аб чым ЦК КП(б)Б і СНК БССР спацяльна на гаварылі ў сваіх пастановах. А трэба ведаць, што ЗРЫЎ ДРУГОГА ЎКОСУ І ПЕРАСТОЙ ТРАЎ ПЕРШАГА ЎКОСУ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ЛЕПШЫМ ДОКАЗАМ АДСУТНАСЬЦІ БАРАЦЬБЫ СА СТРАТАМІ І НЕЖАДАНЬНЯ ЗМАГАЦЦА ЗА СТВАРЭНЬНЕ МОЦНАЙ КАРМОВАЙ БАЗЫ ДЛЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

Узорам такіх бясклопатных і злачынных адносін да важнейшых задач зьяўляюцца апартуністычныя элементы з ЛАГОЙСКАГА РАЙЯА, дзе ўстанавілі апошні тэрмін уборкі сена — 10 жніўня (на 20 дзён пазьней урадавых тэрмінаў). Гэта кулацкая работа павінна атрымаць зьнішчальны ўдар.

Такія-ж адносіны да сенаўборкі праяўлялі і рад іншых раёнаў. Так, ЛЕЛЬЧЫЦКІ раён убраў натуральных сенажацяй 8,1 проц., ТУРАЎСКІ — 15,2 проц., ГОМЕЛЬСКІ — 22,8 проц., ЕЛЬСКІ — 16,6 проц. І г. д. Адставаньне ўказаных і другіх раёнаў нічым ня можа быць апраўдана. Апартуністычная стаўка на самацёк і патураньне кулацка-дзядаўскім традыцыям — вось прычыны адставаньня.

Па апошніх даных НКЗБ плян уборкі натуральных сенажацяй выканан на 53,3 проц. І сеяных траў — на 43,4 проц. На 25 ліпеня ўборку натуральных сенажацяй скончылі толькі тры раёны: АРШАНСКІ (100,1 проц.), ЧЭРВЕНЬСКІ (104,4 проц.), ШКЛОЎСКІ (104,7 проц). Набліжаюцца да выкананьня ВУЗЬДЗЕНСКІ, БЯЛЫНІЦКІ І МАГІЛЕЎСКІ раёны.

Аднак, ня гледзячы на тое, што натуральныя сенажаці тут убраны, уборка сеяных траў у гэтых і другіх раёнах праводзіцца чарапашым тэмпамі. Даны факт паказвае, што і гэтыя раёны не вядуць сыстэматычнай барацьбы за кармовую базу, што і тут стаўка на самацёк дае сябе адчуваць. Гэты факт яшчэ раз пацьвярджае, што рад раёнаў гутаркамі аб неабходнасьці праводзіць уборку на заліўных лугох з прычыны разьліву рэк прыкрывалі сваю бязьдзей насьць. Частковае затрыманьне ўборкі на заліўных лугох давала магчымасьць фарсаваць уборку сеяных траў, але гэта га зроблена ня было. У рэзультаце перастой траў і больш паловы ўсёй плошчы сеяных траў застаецца яшчэ няўбранай.

Далейшае адставаньне сенаўборкі як натуральных сенажацяй, так і сеяных траў цярпець нельга. Раённыя арганізацыі павінны неадкладна забясьпечыць скончаньне сенаўборкі, выканаць пляны сеназдачы, забясьпечыць уборку другога ўкосу і стварэньне моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Не адкладваючы ні адной хвіліны, скончыць уборку сена і максымум сіл кінуць на ўборку збожжавых і здачу дзяржаве с.-г. культур новага ўраджаю.

Зводка НКЗБ

аб ходзе ўборкі натуральных сенажацяй і сеяных траў па раёнах БССР на 25-VII-33 году

Назва раёнаў	Скошана ў проц. Натуральн. сенажацяй	Скошана ў проц. Сеяных траў
1. Дрысенскі	86,0	64,1
2. Лепельскі	39,3	35,6
3. Полацкі	59,9	41,9
4. Асьвейскі	46,8	44,5
5. Вушацкі	48,9	36,3
6. Расонскі	38,3	43,0
7. Бешанковіцкі	38,7	29,5
8. Сіроцінскі	55,7	15,3
9. Чашніцкі	39,5	38,5
10. Аршанскі	100,1	—
11. Віцебскі	96,7	38,4
12. Гарадоцкі	30,3	7,5
13. Дубровенскі	70,3	—
14. Лёзьнянскі	68,4	37,3
15. Сураскі	29,7	39,8
16. Сеньненскі	51,2	32,1
17. Дзяржынскі	77,9	45,2
18. Бягомльскі	48,9	35,5
19. Заслаўскі	72,5	19,2
20. Капыльскі	63,4	68,8
21. Лагойскі	48,4	17,2
22. Менскі	79,9	68,4
23. Вузьдзенскі	90,4	54,2
24. Плешчаніцкі	58,1	27,8
25. Асіпавіцкі	44,1	39,4
26. Барысаўскі	70,7	78,5
27. Бярэзінскі	82,7	75,4
28. Крупскі	48,2	12,4
29. Клічаўскі	47,6	100,0
30. Пухавіцкі	63,0	61,4
31. Смаляніцкі	60,7	41,0
32. Чэрвеньскі	104,	65,1
33. Быхаўскі	50,2	45,6
34. Бялыніцкі	92,3	58,6
35. Горацкі	82,3	38,9
36. Клімавіцкі	46,2	16,6
37. Касьцюковіцкі	69,5	77,2
38. Крычаўскі	70,0	31,7
39. Магілеўскі	92,0	55,5
40. Мсьціслаўскі	85,3	23,0
41. Прапойскі	33,0	51,3
42. Чавускі	86,5	62,7
43. Талачынскі	66,6	48,7
44. Чэрыкаўскі	43,8	57,2
45. Шклоўскі	104,7	39,8
46. Жыткавіцкі	54,3	—
47. Мазырскі	36,5	57,4
48. Слуцкі	83,3	85,8
49. Любаньскі	57,6	50,8
50. Лельчыцкі	8,1	—
51. Старобінскі	72,7	59,6
52. Тураўскі	15,2	57,8
53. Чырвона-Слабодзкі	68,0	88,6
54. Бабруйскі	82,3	41,7
55. Глускі	62,2	100,0
56. Ельскі	16,6	100,0
57. Нараўлянскі	25,1	28,3
58. Парыцкі	71,6	22,5
59. Пятрыкоўскі	23,8	54,1
60. Ст.-Дароскі	52,5	50,0
61. Брагінскі	18,6	89,1
62. Буда-Кашалёўскі	40,6	29,6
63. Веткаўскі	12,5	69,4
64. Гомельскі	22,8	30,4
65. Кармянскі	53,8	73,7
66. Камарынскі	44,5	26,5
67. Жлобінскі	28,1	30,8
68. Лоеўскі	47,5	88,5
69. Рагачоўскі	33,3	47,6
70. Рачыцкі	24,9	55,8
71. Церахаўскі	26,2	17,9
72. Чачэрскі	26,1	50,1
73. Чырвонапольскі	54,2	21,6
74. Уваравіцкі	42,2	27,5
75. Хойніцкі	48,1	76,5
Усяго па БССР:	53,3	43,4
Было на 20-VII:	34,3	33,4
Было на 25-VII-32 г.	42,9	—

УВАГА: Зводка па БССР складзена па 71 раёну па вестках на 25-VII. Клімавіцкі, Буда-Кашалёўскі, Церахаўскі, Камарынскі раёны зводак на 25-VII не прадставілі, па гэтых раёнах весткі ўключаны на 20-VII.

Нач. сэктару вучоту НКЗБ ЛАЎРЫНОВІЧ.

КУЛАЦКІЯ ЎСТАНОЎКІ РАЙЯА

У ЛАГОЙСКУ БЯРУЦЬ СТАЎКУ НА ЗРЫЎ СЕНАЎБОРКІ

Па дырэктывах партыі і ўраду ўборка сенажацяй па БССР павінна была быць скончана не пазьней 20 ліпеня.

Між тым Лагойскі райяа прытрымліваецца другіх тэрмінаў. Наперакор ясным дырэктывам работнікі райяа ўстанавілі такія тэрміны ўборкі сенажацяй, якія вядуць да зрыву свачасовай здачы сена дзяржаве і выпіцьця другога ўкосу. За подпісам загатоўка райяа Амрома і райкіраўпраўома Скрыгакова калгасам дана дырэктыва скончыць сенаўборку да... 10 жніўня. Рэзультаты гэтай кулацкай устаноўкі ў наяўнасьці: плян сенаўборкі натуральных сенажацяй па раёне на 25 ліпеня выканан усяго на 48,4 проц., а сеяных траў — на 17,2 проц.

Раённы камітэт партыі павінен рашуча ўдарыць па кулацкіх агентах з райяа, якія вядуць лінію на зрыў сенаўборкі і свачасовай здачы сена дзяржаве.

Скончылі ўборку ячменю

БРАГІН. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). КАЛГАСЫ ПЕРАДАВОГО КРАЎЧАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ СКОНЧЫЛІ ЎБОРКУ ЯЧМЕНЮ. КАЛГАС «КРОЎКА» ЎЖО ЎБРАЎ ЯЧМЕНЬ І ЖЫТА.

ХІЛІМОНАЎ.

Сёньня ў Бабруйск прыбывае першы чырвоны абоз

Яго павядуць лепшыя калгасьнікі ўдарнікі

Заўтра, 30 ліпеня ў Бабруйск прыбывае першы чырвоны абоз са збожжам новага ўраджаю ў адзнаку міжнароднага чырвонага дня — 1-га жніўня. **Суправаджаць чырвоныя абозы будуць лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі.**

Жніво на палёх Бабруйшчыны разгарнулася 25 ліпеня. Тэмпы нарастаюць. З кожным днём колькасьць калгасаў, прыступіўшых да ўборкі, павялічваецца. Ужо распачалі ўборку каля паловы калгасаў і аднаасобнікаў раёну.

Аднак, колькі гэктараў зжата — невядома, бо райяа не вядзе ўліку. Гэта сьведчыць аб тым, што **уборка захапіла райяа зьнянацку.**

Ужо распачаўся абмалот. Усе нажатыя снопы па меры высыханьня пускаюцца на малатарні і памалочанае збожжа накіроўваецца адразу на прыёмачныя пункты.

Першыя абмалоты паказваюць, што **ўраджай перавышае ўсякія папярэднія меркаваньні.** У калгасе **«Камуніст»**, Харлапавіцкага сельсавету, з аднаго га жыта сабрана 100 пудоў ураджаю звыш 16 цэнтнэраў) у той час, калі меркавалася атрымаць 8-10 цэнтнэраў.

У калгасе імя **1-га мая**, Варабінскага сельсавету, адзін гэктар даў 13 цэнтнэраў збожжа.

У чырвоным абозе 30 ліпеня прымаюць удзел каля 30 калгасаў **Цялускай** МТС, якія па папярэдніх падліках здадуць дзяржаве каля 40 тон збожжа, у тым ліку калгас **«Палітадзелец» — 16 цэнтн., калгасы «Ідзя Леніна», «Прагрэс» — па 1 тоне.**

Калгас **«Усход»**, Верабінскага сельсавету, нажаў 1.715 снапоў жыта і сёньня малоціць іх. Увесь абмалот будзе заўтра здан дзяржаве.

Рабочыя арганізацыі рыхтуюць ура чыстую сустрэчу першага чырвонага абозу.

П. Чыкун.

Першыя дні ўборкі ў калгасах Меншчыны

28 ліпеня тры калгасы Строчыцкага сельсавету Менскага раёну: ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА, АДПУ і «ЧЫРВОНАЯ НІВА» пачалі жніво.

Калгас імя Дзяржынскага яшчэ 27 ліпеня правёў масавы выезд у поле для праверкі гатоўнасьці брыгад, машын і зьвеньняў да ўборкі ўраджаю. У часе пробнага выезду зжата каля 0,5 га жыта. (Агульная плошча, занятая пад пасевамі азімага жыта, складае ў калгасе 216 га). 28 ліпеня паляводчая брыгада № 1 зжала 15 га жыта і склала яго ў копы.

Першы выезд паказаў, што калгас поўнасьцю гатоў да масавага жніва. Выезд таксама выявіў рад дробязяй, з-за якіх могуць здарыцца прастоі ўборачных машын. Такімі дробязямі аказаліся недахват шрубак і інш. рэчаў, якія можна вырабляць на месцы. Каб забясьпечыць бесьперабойную работу машын, дзяржынцы ў той-жа дзень арганізавалі паходныя кузьні пры кожнай брыгадзе, непасрэдна на вучастках, дзе працуюць машыны. Рамонт робіцца на месцы, а жанчыны ў гэты час, што абслугоўваюць машыны, пераключаюцца на ручное жніво. Такім чынам кожная хвіліна скарыстоўваецца для паскарэньня тэмпаў уборкі. Вялікую эканомію часу дае дастаўка харчаваньня ў поле. Праўленьне калгасу свачасова арганізавала кухню і ў тэрмасах развозіць гарачую страву на поле. Для выпечкі хлеба і гатаваньня стравы вылучаны ўдарніцы—дайльшчыцы, якія без адрыву ад сваёй непасрэднай работы ўпраўляюцца выконваць і кухонныя справы.

Для правільнага і дакладнага ўліку работы і ўраджаю кожны дзень пасьля работы брыгады складаюць акты, дзе за пісваецца зжатая плошча і колькасьць атрыманых коп. Адказнасьць за ахову ўраджаю на полі нясе брыгада да таго часу, пакуль яго ня прыме зьвяно малацьбітоў.

Уся работа па арганізацыі ўборкі пра ходзіць пад непасрэдным кіраўніцтвам 1-ай Менскай МТС на чале з палітаддзелам. Перад пачаткам уборкі палітаддзелам былі праведзены аднадзенныя зьлёты брыгадзіраў, трактарыстаў, рахункаводаў, старшынь калгасаў і г. д. Толькі дзякуючы свачасова праведзенай арганізацыйна-масавай рабоце Строчыцкія калгасы, пад кіраўніцтвам палітаддзелу МТС, з посьпехам змагаюцца за тэрміны ўборкі і арганізацыю 1-га жніўня чырвоных абозаў за збожжам і датарміновую здачу збожжа дзяржаве.

ПРЫВІТАНЬНЕ ПЕРШАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЛЁТУ ПЕРАДАВЫХ СЕЛЬСАВЕТАЎ

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО

Першы рэспубліканскі зьлёт старшынь перадавых сельсаветаў шле ЦК КП(б)Б на чале з цьвёрдым бальшавіком тав. Гікало баявое прывітаньне.

Дзякуючы цьвёрдаму апэрацыйнаму кіраўніцтву ЦК КП(б)Б, БССР у гэтым годзе з большым посьпехам чым калі-небудзь раней, правяла веснавую сяўбу, забясьпечыўшы высокі ўраджай сацыялістычных палёў.

Аднак, мы не захапляемся дасягнутымі посьпехамі, улічваючы, што ў БССР ня выкарыстаны ўсе магчымасьці, каб дабіцца ў гэтым годзе яшчэ больш буйных посьпехаў у сяўбе, а асабліва ў ворыве папараў і правядзеньні прапалачнай.

Сабраўшыся ў пачатку масавай уборкі ўраджаю, мы запэўняем ЦК КП(б)Б і цябе, тав. Гікало, што ўлічым недахопы і памылкі мінулага, уздымем ролю саветаў у барацьбе за выкананьне гаспадарча-палітычных задач і пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б будзем змагацца за пасьпяховае вырашэньне важнейшай і цэнтральнай задачы дня — забясьпечыць свачасовую і без страт уборку палёў і першачарговае выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай, заказаўшы для БССР адно з першых месц на ўсесаюзнай чырвонай дошцы.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало!

Першы ўсебеларускі зьлёт старшынь перадавых сельсаветаў.

КАЛГАСЫ МТС—У АВАНГАРДЗЕ

РАГАЧОЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

НА АСНОВЕ ШЫРОКАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, РЭАЛІЗУЮЧЫ ПАСТАНОВЫ ДРУГОГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ, **КАЛГАСЫ РАГАЧОЎСКАЙ МТС** НА 24 ЛІПЕНЯ 1933 Г. ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПЛЯН СЕНАЗАГАТОВАК **НА 101,5 ПРОЦ.** ЗДАНА ДЗЯРЖАВЕ 1.248 ЦЭНТН. СЕНА ЗАМЕСТ 1.229 ЦЭНТН., ВЫЗНАЧАНЫХ ПЛЯНАМ.

***

ПУХАВІЧЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

ГАДАВЫ ПЛЯН СЕНАЗДАЧЫ ДЗЯРЖАВЕ КАЛГАСЫ ПУХАВІЦКАЙ МТС ВЫКАНАЛІ. ПЛЯН — 140 ТОН, ЗДАНА ДЗЯРЖАВЕ НА 25 ЛІПЕНЯ 141 ТОНА.

Начпалітаддзелу Пухавіцкай МТС КЛЫС.
Дырэктар МТС ГАНЧАРОЎ.

„НІ АДНАГО КІЛЁГРАМА ЗВЫШ НОРМЫ ЗДАЧЫ"

Пад гэтым загалоўкам «Известия» зьмясьцілі ва ўчарайшным нумары тэлеграму свайго спэцыяльнага карэспандэнта з **Краснадару** наступнага зьместу:

«Учора заканчваючы пастаўку жыта дзяржаве, арцель «Ударнік» прывезла мясцоваму элеватару 3.161 кгр. збожжа. Але каб выканаць гадавы плян здачы жыта і аплаціць натурай работу МТС, калгасу заставалася здаць толькі 3.114 кгр. жыта. Скончыўшы прыёмку гэтай колькасьці збожжа, вагаўшык элеватару тав. Калтай у прысутнасьці калгасьнікаў іншых калгасаў і старшыні арцелі «Ударнік» тав. Папова, вярнуў вагаўшчыком арцелі 47 кгр., як лішнядастаўленыя для здачы. Старшыня збожжавым абозе «Ударнікў» тав. Шэвэк быў выгнаны прыняць збожжа і вярнуў яго ў калгасны сыпкіран. Дзяржава звыш пагэктарнай нормы збожжаздачы не прыняла 47 кгр. збожжа.

Высокая дакладнасьць, з якою дзяржава захоўвае кожнае слова непарушнага закону аб збожжапастаўках, робіць вялізарнейшае ўражаньне ў калгасах. Гэта лішні раз падкрэсьлівае, якую вялізарную палітычную ролю адыгрывае бальшавіцкая дакладнасьць у рабоце кожнага супрацоўніка Загатзбожжа. **Работнікі мясцовага элеватара гэта ўсвоілі».**

АД РЭДАКЦЫІ: Мы наўмысьля перадрукоўваем гэту тэлеграму з тым, каб завастрыць увагу ўсіх загатоўчых арганізацый БССР на вялізарную важнасьць дакладнага захоўваньня пагэктарных норм збожжаздачы.

Закон аб цьвёрдых пастаўках зьяўляецца непахісным і князьменным законам, які павінен выконвацца дакладна і безагаворачна. Прыкладу работнікаў Краснадарскага элеватара, якія паказалі, што яны добра ўсвоілі вялізарную палітычную ролю бальшавіцкай дакладнасьці ў прыёмцы збожжа, павінны пасьледаваць усе работнікі загатоўчых арганізацый нашай рэспублікі.

СЕНАЗДАТЧЫКІ НЕ ДАЧАКАЛІСЯ ПРЫЁМКІ

ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ЗРЫЎШЧЫКАЎ СЕНАЗАГАТОВАК

ПОЛАДАК. (Брыгада «Зьвязды»).

Апарат полацкай міжраённай канторы Загатзбожжа засьмечан чужым клясава-варожым элементам. Пам. загадчыка канторы **Жукоўскі** Васіль — сын кулака, высланага з БССР, кладаўшчык **Клеманскі** — непрабудны п'яніца, прыёмшчык Баблінскага пункту **Левіт** — былы гандляр.

Як ідуць сенязагатоўкі па раёнах, якія абслугоўваюцца канторай Загатзбожжа? Па **Полацкім** раёне павінна быць загатоўлена 13 тыс. тон сена, загатоўлена-ж было на 18 ліпеня толькі 400 тон. Па **Дрысенскім** раёне замест 800 тон загатоўлена 4 тоны 640 кгр., па **Расонскім** — замест 700 тон — 13 тон. Колькі загатоўлена па **Вушацкім** і **Асьвейскім** раёнах — **невядома**, бо кантора Загатзбожжа не вядзе належнага ўліку.

Склады і прыёмачныя пункты працуюць дрэнна і не падрыхтаваны да прыёмкі прадукцыі. Загадчык складу на ст. Брамы тав. **Аліб'еў** адкрыта прызнае, што прадпісьцьміны сярод работнікаў складу няма. 16 ліпеня на пункт прыехала 150 фурманак для здачы сена, аднак, калгасьнікі так і не дачакаліся трыёмшчыкаў і вымушаны былі вярнуцца ў калгас, ня здаўшы сена.

Старшыня калгасу «Парыжская камуна», Шацілаўскага сельсавету, расказвае: «Ужо другі раз мы возім сена і ніяк ня можам дабіцца, каб яго прынялі, бо не пасьпее дайсьці да нас чарга — ужо 3 гадзіны і склад зачыняецца на абед».

Прыёмачныя пункты не забясьпечаны вагамі, гірамі і тарай, штат падобран дрэнна; культурна-бытавое абслугоўваньне здатчыкаў не наладжана.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што намінёньня раённыя арганізацыі недаацэньваюць важнасьці падрыхтоўкі да загатоўчай кампаніі і не аддаюць гэтай справе належнай увагі.

Патрэбны неадкладныя і рашучыя меры.

Фрыд, Іваноў, Міркін.

За добраякасны абутак

Менская агульна-гарадзкая партыйная канфэрэнцыя па якасьці гарбарна-абутковай прадукцыі, якая (канфэрэнцыя) зараз адбываецца, мае вялізарнае значэньне. Пытаньні ўсямернага паляпшэньня якасьці прадукцыі, сыстэматычнага зьніжэньня сабекошту і ўзьнясьцьця прадукцыйнасьці працы — цэнтральныя пытаньні барацьбы партыі і працоўных краіны за пасьпяховае выкананьне ў

СССР і Гішпанія

Паведамленьне аб устанаўленьні дыпляматычных адносін паміж СССР і Гішпаніяй мае бясспрэчна буйнае значэньне. Абмен тэлеграмамі, які адбыўся паміж гішпанскім і савецкім урадамі, прадугледжвае ўзаемнае прызнаньне дэ-факто і дэ-юрэ. Пасьля прызнаньня паслоў СССР і Гішпаніяй прыступяць да гандлёвых перагавораў.

Устанаўленьне дыпляматычных адносін з Гішпаніяй знаходзіцца ў поўнай адпаведнасьці з пасьлядоўнай палітыкай міру, што праводзіцца ўрадам Савецкага саюзу, які быў і застаецца адзінай дзяржавай на зямлі, якая ўсімі сіламі змагаецца за сапраўднае разбраеньне, за сапраўдны мір.

СССР — АПЛОТ МІРУ. Гэтага ня могуць ня прызнаць нават яго клясавыя ворагі. Усё меншым і меншым становіцца лік буйных капіталістычных краін, якія яшчэ ня сталі на шлях нармальных адносін з Савецкім саюзам. На гэты шлях стала зараз Гішпанія.

Буйная эўрапэйская краіна, якая займае значную частку Пірынейскага паўострава — Гішпанія адчувае на сабе ўдары эканамічнага крызісу, які ўсё больш пагыбляецца. Ня гледзячы на тое, што намаганьнямі цяперашняга ўраду было дасягнута некаторае выраўноўваньне гандлёвага балянсу, яно цалкам пашло за кошт далейшага зьніжэньня абсалютных лічбаў экспарту і імпарту. За красавік бягучага году ўвоз у Гішпанію склаў 70 млн. залатых пэзэт, тады як у красавіку 1932 г. ён раўняўся 81 млн., а ў тымжа месяцы 1931 г. — 117 млн. Няўхільна падае і вываз з Гішпаніі (красавік 1933 г. — 54 млн. пэзэт, 1932 г. — 68 млн., 1931 г. — 101 млн. пэзэт). Гішпанская пэзэта абясцэньваецца. Усе разьлікі на тое, што ў ліпені ўдасца выкупіць золата, закладзенае ў францускім банку, аказаліся фантастычнымі — рэшта доўгу складае яшчэ 1 мільярд 200 мільёнаў франкаў. Расьце дэфіцыт гандлёвага балянсу.

Эканамічная вайна, якая пануе ў капіталістычным сьвеце, мытныя перапоны, уведзеныя вялізарнай большасьцю краін, куды наніроўваўся экспарт з Гішпаніі (у прыватнасьці Англія), нанесьлі адчувальныя ўдары гішпанскай сельскай гаспадарцы. Працуючыя ў асноўным на экспарт, прамысловасьць і сельская гаспадарка Гішпаніі б'юцца ў ціскох крызісу.

Цяперашні ўрад, складзены з радыкальных буржуазных элемэнтаў з удзелам гішпанскіх сацыял-дэмакратаў, падпадае бязупыннаму націску з боку шырокіх працоўных мас, становішча якіх нязьменна пагоршваецца.

Бясспрэчна, што як радыкальныя буржуазныя групоўкі, так і ў асаблівасьці сацыял-дэмакратычныя лідэры вымушаны былі ўступіць магутнаму націску, які аказваюць на ўрад працоўныя масы Гішпаніі, нязьменна выстаўляўшыя ва ўсіх сваіх выступленьнях лёзунг устанаўленьня нармальных адносін паміж Гішпаніяй і Савецкім саюзам. Працоўныя масы Гішпаніі, якія маюць гарачыя сымпатыі да вялікай краіны, дзе будуецца сацыялізм, аказалі пэўны ўплыў на ход падзей, прывёўшых да вядомага ўжо рашэньня гішпанскага ўраду.

Пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР, грандыёзныя гаспадарчыя перамогі — такавы НОВЫЯ ФАКТАРЫ, з якімі не маглі не палічыцца ЎСЕ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ капіталістычныя краіны, і ў тым ліку Гішпанія.

Савецкі саюз вырас у буйнейшую міжнародную палітычную і эканамічную сілу. Капіталістычны сьвет вымушан быў прызнаць, што толькі СССР уяўляе сабой узрастаючую эканамічную краіну, дзе няма эканамічнага крызісу і дзе найбольш устойлівы палітычны рэжым. Прызнаньне гэтага факту на фоне бязупынных посьпехаў мірнай палітыкі Савецкага саюзу і яго адносін з асобнымі краінамі, на фоне ўсё новых і новых перамог у галіне сацыялістычнага будаўніцтва ўнутры краіны, прывяло да імкненьня цэлага раду капіталістычных краін палепшыць і ўмацаваць свае адносіны да СССР.

Паміж СССР і Гішпаніяй ня існуе ніякіх перашкод для нармальнага разьвіцьця іх узаемаадносін. Гішпанія зацікаўлена ў савецкай нафце і з 1925 году праз пасярэднікаў, а ў 1927 годзе непасрэдна праз свае дзяржаўную нафтавую манаполію ўваходзіць у дзелавую сувязь з нашым нафтасьндыкатам, заключаючы дагавор на пастаўку савецкіх нафтапрадуктаў. Пад уплывам рэвалюцыйных колаў, зьвязаных з дарэвалюцыйным урадам БЭРЫНГЕРА, пад націскам міжнародных нафтавых трэстаў у 1930 годзе спыняецца дастаўка савецкай нафты ў Гішпанію. Аднак, гэты дагавор быў адноўлен у красавіку 1931 году і існуе да сучаснага моманту. Апрача нафты гішпанскі рынак адчувае патрэбу ў радзе іншых відаў савецкага сырцу. Савецкі саюз са свайго боку таксама зацікаўлен у разьвіцьці гандлёвых сувязяй з Гішпаніяй.

Такім чынам прадпасылкі для разьвіцьця і ўмацаваньня адносін паміж абедзьвюма краінамі ў наяўнасьці.

Савецкая грамадзкасьць бясспрэчна будзе шчыра вітаць аднаўленьне нармальных адносін паміж СССР і Гішпаніяй.

(СКАРОЧАНЫ ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ «ПРАВДЫ», ПЕРАДАНЫ ПА РАДЫЁ).

„СССР можна пазайздросьціць"

ЛЁНДАН, 28 (Белта). Лібэральная «Н'ЮС КРОНІКЛЬ» публікуе на відным месцы артыкул вядомага канадзкага журналіста, рэдактара-выдаўца газэты «Ванкувэр Сэн» КРОМІ, прыбыўшага ў Лёндан пасьля наведаньня СССР.

Кромі заяўляе, што «ні адзін празорлівы чалавек ня можа, наведаўшы СССР, паехаць адтуль без пачуцьця глыбокай павагі да поглядаў і праматы ўрадавай палітыкі і без вялізарнага ўражаньня, якое робіць антузіязм і гордасьць, праяўляемыя рускім народам пры ажыцьцяўленьні сваіх плянаў».

Далей Кромі параўноўвае адсутнасьць беспрацоўя ў СССР з наяўнасьцю шмат мільённых армій беспрацоўных у капіталістычных краінах і прызнае, што бачанае ім у СССР поўнасьцю абвяргае антысавецкія вымыслы некаторых газэт.

У заключэньні Кромі заяўляе: «У СССР ёсьць цяжкасьці — гэта верна, але ці можна мець усе гэтыя дасягненьні без некаторыхахвяр? Тэмпы і жыцьцярадаснасьць, якія наглядаеш і адчуваеш усюды ў СССР, зьяўляюцца адкрыцьцём для большасьці людзей. СССР можна зайздросьціць».

Калі-ж адбудзецца працэс Ван-дэр-Любэ?

Незразумелая блытаніна фашысцкіх паведамленьняў

БЭРЛІН, 28 (Белта). Агенцтва «ВОЛЬФ» пашырае наступнае «растлумачэньне» аб працэсе Ван-дэр Любэ: «У сувязі з прыёмам прадстаўнікоў друку ў баварскага міністра юстыцыі Франка, памылкова паведамлялася, што працэс падпальшчыка рэйхстагу Ван-дэр-Любэ адбудзецца ў Вярхоўным судзе ў канцы лістапада ці ў пачатку сьнежня. У процівагу гэтаму зноў паведамляецца, што працэс Ван-дэр-Любэ адбудзецца, напэўна, у першай палове верасьня.

Да гэтага паведамленьня «Вольфа» «БЭРЛІНЭР ТАГЕБЛЯТ» дадае, што «абвінавачаньне» накіравана паміма Ван-дэр-Любэ таксама супроць былога дэпутата рэйхстагу ТОРГЛЕРА І СУПРОЦЬ ТРОХ АРЫШТАВАНЫХ БАЎГАРСКІХ КАМУНІСТАЎ».

Новы антырабочы дэкрэт у Германіі

БЭРЛІН, 28. (БЕЛТА). Апублікаван «дэкрэт аб гаспадарчым міры» і загад кіраўніцтва нацыянал-сацыялістскіх вытворчых ячэек, якія сьведчаць аб тым, што абвешчаны ўрадам «мір у гаспадарцы» спатканы пралетарыятам у штыкі. «Дэкрэт аб гаспадарчым міры» награжае ваенным судом тым рабочым, якія будуць супраціўляцца ў выкананьні ўрадавага дэкрэту аб «міры ў гаспадарцы». Кіраўніцтва нацыянал-сацыялістскіх вытворчых ячэек прабуе аслабіць у сваім загадзе абурэньне нізоў, якія пераканаліся ў фальшывасьці нацыянал-сацыялістскай дэмагогіі, і апраўдваецца перад імі, заяўляючы, што «шаўнаважаныя адхілены з прычыны «асобных абставін».

Скарачэньне зарплаты гарнякоў у Польшчы

ВАРШАВА, 28 (Белта). Арбітражная камісія ў вугольнай прамысловасьці ВЕРХНЯЙ СІЛЕЗІІ пастанавіла скараціць зарплату гарнякоў на 6-13 проц. Усе прафсаюзныя арганізацыі адхілілі гэта рашэньне і склікалі канфэрэнцыю прадстаўнікоў шахт на 30-е ліпеня ў Катавіцах. Лідэры сацыял-фашысцкіх прафсаюзаў усяморна імкнуцца адцягнуць выступленьні рабочых і даць арбітражнай камісіі магчымасьць дабіцца зацьвярджэньня яе рашэньня ўрадам. Побач са скарачэньнем зарплаты адбываецца закрыцьцё шахт.

* * *

ВАРШАВА, 28 (Белта). Для скарачэньня беспрацоўя міністэрства шляхоў зносін распарадзілася зволіць з работы ўсіх працуючых на чыгунках замужніх жанчын.

Інтэрв'ю начальніка штабу квантунскай арміі

УЛАДЫВАСТОК, 26 (Белта). Газэта «Мэйсю Ніппо» 23 ліпеня публікуе інтэрв'ю начальніка штабу квантунскай арміі генэрала Койсо, у якім апошні ўказвае, што ў сувязі з перасоўваньнямі часьцей Чырвонай арміі ў Забайкальлі, пашыраюцца непраўдападобныя чуткі аб тым, быццам набліжаецца савецка-манчжурскі канфлікт, у той час, як у сапраўднасьці за апошні час савецка-манчжурскія адносіны, наадварот, значна палепшыліся. Гэта даказваецца тым, што савецкі бок дазволіў манчжурскай флётыліі навігацыю на Амуры.

Японскі друк аб ваенных плянах ПАЗШ у Кітаі

ШАНХАЙ, -28. (БЕЛТА). Японскія крыніцы ў Шанхаі, у асноўным паўтаралочы паведамленьне «Асахі» і «Сьмбун Рэнга» аб ваенных плянах ПАЗШ у паўднёвым Кітаі, указваюць, што ПАЗШ паміма пабудаваньня морскай базы ў затоцы Дуньшан, намераны пабудаваць некалькі аэрадромаў у правінцыі Фуцьзян, пракласьці дарогу, якая злучае ўзьбярэжжа правінцыі з унутранай тэрыторыяй, а таксама прадаставіць пэўную суму на ўмацаваньне абароны правінцыі Фуцьзян.

Далейшае абвастрэньне японска-ангельскай эканамічнай вайны

ТОКІО, 27. (БЕЛТА). Эканамічная вайна паміж Японіяй і Англіяй абвастрэцца. Японскі пасол у Англіі Мацудайра паведаміў японскае міністэрства замежных спраў, што ангельскі ўрад адхіліў японскі праэкт супроць абмежаньня дзеяньня японска-брытанскага гандлёвага дагавору ў Заходняй Афрыцы і павышэньня мытаў на японскія тавары ўжо пасьля таго, як сусьветная эканамічная канфэрэнцыя прыняла прапанову аб мытным перамір'і. Паводле слоў «Сьмбун Рэнга», у міністэрстве замежных спраў вельмі заклапочаны «цяпкрысьцю брытанскага ўраду» ў неўрогуляваных пытаньнях.

Перад 1 жніўня за мяжой

ВЕНА, 28 (Белта). Згодна паведамленьня з БУХАРЭСТУ, па ўсёй Румыніі ад бываюцца масавыя арышты. У ТЭМЭШВАРЫ арыштаваны многія рабочыя, прозьвішчы якіх нібыта былі ўказаны ў сьпісе, знойдзеным у забітага паліцэйскімі рабочага. Лік арыштаваных настольшы вялікі, што ў горадзе арганізован новы канцлягер. У ЛУЖЫ арыштавана звыш 100 рэвалюцыйных рабочых У ТУРДЗЕ, ТЫРГУМУРЭШЭ І ОРАДЗІ —новыя масавыя арышты. У КЛУЖЫ арыштаваны ў якасьці заложнікаў жонка і дзіця ўцёкшага рэвалюцыйнага рабочага.

* * *

РЫГА, 28 (Белта). За апошнія дні ў раёне РЭЖЫЦЫ арыштавана 25 рэвалюцыйных рабочых. Мінулай ноччу ў РЫЗЭ арыштавана 15 чалавек, якія расклейвалі першажнівеньскія камуністычныя адозвы. У рабочых раёнах Рыгі праведзены масавыя аблавы.

* * *

ПАРЫЖ, 28 (Белта). У «ЮМАНІТЭ» КАШЭН, указваючы, што францускія сацыялістычныя рабочыя па-ранейшаму далучаюцца да Амстэрдамскага антываеннага руху, піша, што толькі за апошнія тыдні да гэтага руху далучыліся 50 новых груп сацыялістычных рабочых.

Выкрываючы сацыял-фашысцкіх кіраўнікоў, Кашэн указвае, што яны на апошнім зьезьдзе францускіх сацыял-фашыстаў самі пацьвердзілі сваю гатоўнасьць абараняць капіталізм, як яны гэта рабілі ў 1914 г.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ШАНХАЙСКАГА АНТЫВАЕННАГА КАНГРЭСУ

ШАНХАЙ, 28 (Белта). Прадстаўніцтва камісіі па падрыхтоўцы скліканьня шанхайскага антываеннага кангрэсу Сун Цзін-лін выпусьціла маніфэст, у якім паведамляе, што кангрэс адбудзецца ў верасьні. Дакладная дата будзе Устаноўлена пасьля прыезду ў Шанхай дэлегацыі сусьветнага камітэту супроць імпэрыялістычнай вайны ў складзе Лёрда Мэрлея, Вайян Кутур'е, Марці і інш. Адзначаючы надзвычайнае разьвіцьцё ваеннай прапаганды ў капіталістычных краінах, супроць якой павінны паўстаць усе працоўныя, маніфэст заяўляе, што шанхайскі кангрэс не абмяжоўвае рамкамі якой-небудзь палітычнай партыі. Ён будзе вітаць кожнага, хто дапаможа яму ў папярэджаньні новай імпэрыялістычнай вайны.

Манчжурскі друк аб выступленьнях паўстанскіх атрадаў у Манчжурыі

Уладывасток, 26 (Белта). У Манчжурскай прэсе пачынаюцца паведамленьні аб актыўнасьці антыўрадавых атрадаў. Паводле паведамленьня газэты «Дагунбао», сталіца новай дзяржавы—Чаньчунь абвешчана ў начны час на ваенным становішчы.

Актыўнасьць паўстанцаў адзначаецца ў раёнах каля Харбіну ў раёне г. Ачэну, гораду Дуніна, уздоўж ракі Усуры ад гораду Хулінна да Жаохэ, у нізоўях ракі Сунгары, у раёне гораду Гірына і на поўдзень ад яго.

Як паведамляе газэта «Гоцэісэбао», агульная колькасьць паўстанцаў у пры харбінскім раёне вылічаецца ў 3 тысячы чалавек пры кулямётах і нават гарматах, прычым адзначаецца, што баі паўстанцаў з урадавымі войскамі адбываюцца амаль штодзённа. Згодна паведамленьня газэты «Дайрэн-Сымбун», у нядаўняй сутычцы каля гораду Учана (у раёне Усходняй лініі КУЧ) былі забіты 24 японскія салдаты і тры унтэрафіцэры і некалькі чалавек паранены.

Як паведамляе прэса, у раёне гораду Жаохэ ў нізоўях ракі Усуры ёсьць нават галоўнае камандаваньне антыўрада вых войск, якое яднае шмат разрозьненых атрадаў у некалькі тысяч чалавек. Гэтыя атрады захапілі параход Туньшан, які пад антыманчжурскім сьцягам абслугоўвае іх патрэбы».

Прэса адзначае таксама баі карных войск з паўстанцамі ў раёне гораду Мішаня, прычым паўстанцы каля вёскі Хэйцзосу разьбілі манчжурскі полк. Камандзір палка забіт. 22-га ліпеня згодна паведамленьня прэсы, паўстанцамі захвачан у палон параход «Цзяньсун» у нізоўях Сунгары, з якога ўведзена 20 пасажыраў і 4 чалавекі каманды.

Рэпэструюцца штодзённыя напады ў паўднёвай частцы Гірынскай правінцыі ў раёнах Гірын-Хайлунскай і Гірын-Дунхускай чыгунак. Як паведамляе газэта «Мансю-Ніпо», 23 ліпеня вроблен напад 300 паўстанцаў на цягнік па Гірын-Хайлунскай чыгунцы. Уведзены ў палон 30 пасажыраў. Усе гэтыя напады зьвязваюцца з паўстаньнем і без таго дужкага становішча манчжурскіх сялян.

Водгукі на закрыцьцё лёнданскай канфэрэнцыі

ЛЁНДАН, 28 (Белта). Ужо на наступным дзень пасьля пахаваньня сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі зьявіліся першыя адзнакі, якія пацьвярджаюць указаньне тав. Майскага на заключным пасяджэньні, што крах канфэрэнцыі прывядзе да нябывалага росквіту эканамічнага нацыяналізму. Прадстаўнікі Англіі і дамініёнаў (за выключэньнем Ірляндыі) апублікавалі сумесную дэкларацыю, багатую эканамічнымі пагрозамі па адрасе ПАЗШ. Дэкларацыя адзначае неабходнасьць у канчатковым выніку аднавіць міжнародны залаты стандарт, а да дасягненьня гэтай мэты настойвае на стабілізацыі суадносін валютных курсаў унутры Імпэрыі. Друк 6-тае дэкларацыю як крок да стварэньня «стэрлінгавага блёку».

* * *

БЭРЛІН, 28 (Белта). Большасьць газэт ня можа ўтаіць свайго расчараваньня тым, што адзіным пераможцам на лёнданскай канфэрэнцыі зьявіўся СССР.

«Бэрлінэр Бэрзэн цэйтунг» адзначае, што «Літвінаў дабіўся ў Лёндане амаль усяго, чаго ён хацеў: уладжан англа-савецкі гандлёвы канфлікт, падпісан рад пактаў аб ненападзе, пракладзены шляхі да эканамічнага і палітычнага ўзаемаразуменьня са Злучанымі Штатамі».

«Фосішэ цэйтунг», праводзячы паралель паміж лёзанскай і лёнданскай канфэрэнцыямі, заяўляе, што «калі Мак Дональд быў перамежцам у Лёзане, дык у Лёндане перамог Літвінаў».

* * *

ПАРЫЖ, 28 (Белта). Амаль усе газэты, ня выказваючы ніякага жалю з поводу правалу эканамічнай канфэрэнцыі, прыводзяць заявы Пэі ў «Эксцэльсіёр»: «адзіная заслуга канфэрэнцыі ў тым, што яна дала магчымасьць аформіцца залатому блёку і арганізаваць абарону цьвёрдых валют». Адказнасьць за правал канфэрэнцыі францускі друк ускладае «на іншыя краіны», у прыватнасьці на ПАЗШ.

* * *

ЛЁНДАН, 28 (Белта). З Аўстраліі і Новай Зэляндыі паведамляюць, што ў раёне брытанскіх эліскіх астравоў (у Заходняй частцы Ціхага акіяну) было выяўлена патаемнае судно, старое на выгляд, але вдольнае разьвіць хуткасьць у 20 вузлоў і ў сілу гэтага ўсьлізваючае ад праследваньня. Паводле вестак, каманда судна складалася з 20 японцаў. Судно, як відаць, рабіла разьведку ў раёны астравоў. У сувязі з гэтым паведамляюць, што падобнае судно было падаўна выяўлена ў раёне Саламонавых астравоў.

Карэспандэнт «Дэйлі Геральд» у Брысбэне (Аўстралія) у сувязі з гэтым заяўляе: «Вядома, што Японія з хіжасьцю паглядае на паўночную Аўстралію і Ціхаакіянскія астравы».

Замежная хроніка

* Начальнік Н'ю-ёркскай паліцыі ў прытаньні да міжнароднай паліцэйскай канфэрэнцыі ў Чыкага прапанаваў арганізаваць міжнародную паліцыю для барацьбы супроць камуністычнага руху.

* Савет міжнароднага геалёгічнага кангрэсу пастанавіў большасьцю 42 галасоў супроць аднаго прыняць прапанову савецкіх дэлегатаў аб скліканьні міжнароднага геалёгічнага кангрэсу ў 1936 г. у СССР.

* Вярхоўны суд штату Алябама назначыў перагляд справы 7-мі старэйшых вязьняў Скотсбора ў горадзе Афіны ў кастрычніку. У лік гэтых 7-мі ўвайшоў таксама і Пэтэрсон, прыгавораны пры папярэднім разглядзе справы да кары сьмерцю. Справа 2-х малодшых вязьняў Скотсбора падлягае разгляду суда па справах няпоўналетніх.

* На дадатковых муніцыпальных выбарах у Рыске (Паўднёвы Уэльс) кандыдат кампартыі КУТ, які выступаў супроць аднаго лейбарыста і трох незалежных кандыдатаў, выбран большасьцю ў 522 галасы. Кампартыя чацьверты раз выстаўляе кандыдата Рыске, пры чым лік паданых за яго галасоў няўхільна ня ўзрастаў. На першых выбарах яе кандыдат атрымаў 95 галасоў.

* Камандаваньне шведскай ваенна-морской базы ў Карльскроне пад уплывам хваляваньня маракоў вымушана было выдаць загад аб палепшэньні харчаваньня. Адданы пад суд маракі пры допыце заявілі, што прычынай дэманстрацыі было дрэннае харчаваньне. Суд забараніў абвінавачаным падрабязна спыняцца ў паказаньнях на прычынах пагоршаньня харчоў.

Абвінавачаныя прысуджаны да турмы на месяц кожны.

* У Мадрасе (Індыя) арыштован генэральны сакратар індыйскага аб'яднаньня прафсаюзаў Мукундалал Саркар.

Адкрылася менская агульна-гарадзкая партканфэрэнцыя па якасьці гарбарна-абутковай прадукцыі

Учора ў клюбе Камасьветы адкрылася менская агульна-гарадзкая партыйная канфэрэнцыя па якасьці гарбарна-абутковай прадукцыі. Канфэрэнцыю адкрыў загадчык аргаддзелу Менгаркому КП(б)Б тав. Гершон.

Па прапанове прадстаўніка дэлегацыі гарбарні «Бальшавік» тав. Шамэса ў склад прэзыдыуму канфэрэнцыі выбраны т. т. Гікало, Гападзед, Чарвякоў, Анціпаў, Сахарава, Лычоў, члены бюро ЦК, прэзыдыуму ЦКК, прэзыдыуму гарКК, прэзыдыуму гарпрафсавету, ударнікі гарбарні «Бальшавік», фабрыкі імя Кагановіча, фабрыкі «Усход», фабрыкі імя Тэльмана, абутковай майстэрні гарсавету.

Пасьля выбраньня прэзыдыуму канфэрэнцыя прыступіла да дзелавой работы. З дакладам аб выкананьні гарбарна-абутковай прамысловасьцю якасных паказальнікаў прамфінпляну за першае паўгодзьдзе і практычных мерапрыемствах па рэалізацыі пастаноў аб'яднанага ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б на лёгкай прамысловасьці выступіў дырэктар Скурабутковага трэсту тав. Эфроімскі.

Хроніка

* ВСФК БССР арганізуе фізкультурныя спаборніцтвы гігантаў прамысловасьці. У спаборніцтва прымуць удзел калектывы заводу імя Варашылава (Менск), Гомсельмаш, шаўковая фабрыка (Магілеў), добруская фабрыка, бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат і інш. Задачы спаборніцтва—узмацніць нізавое фізкультурнае зьяваю і перанесьці вопыт лепшых нізавых спартыўных арганізацый у падрыхтоўку да сусьветнай спартакіяды.

* Для падрыхтоўкі інструктароў і мэтадыстаў ЦП саюзу працасьветы арганізавала кароткатэрміновыя курсы на 100 чалавек. На курсы пасланы настаўнікі-ўдарнікі, якія маюць вялікі стаж настаўніцкай работы.

* Беларускі дзяржаўны тэатр юнага гледача выехаў на паўтары месяцы ў піянэрскія лягеры ў Бабруйску, Віцебску і інш. Тэатрам падрыхтован для выезду спэцыяльны канцэрт. Пасьля прыезду ў Менск ДТЮГ пачне работу над клясычнай камедыяй Мальера «Ад вакат Натэлен».

* У жніўні выходзіць «бюлетэнь інстытуту эканомікі БАН», які будзе падагульняць навуковыя працы інстытуту па пытаньнях палітэканоміі, сацыялістычнага будаўніцтва і распрацоўкі праблемы марксызму і ленінізму.

* Кемплетныя брыгады інстытутаў БАН: эканомікі, біалёгіі і глебазнаўства выяжджаюць у вярхоўе Дняпра (Віцебскі, Гарадзкі і Сурасні раёны) для выпрацоўкі рабочых праектаў да праблемы Вялікага Дняпра.

* У жніўні выходзіць эканамічны справачнік усіх раёнаў БССР з адпаведнымі картамі, які падрыхтаваны інстытутам эканомікі БАН.

НАЧПАЛІТСКЛАДУ І ВЫПУСКНІКОМ ШКОЛЫ РС МІЛІЦЫІ БССР ІМЯ М. В. ФРУНЗЭ

Горача вітаю вас, таварышы, з тымі вялікімі посьпехамі, якія вы атрымалі, дзякуючы шырока разгорнутаму сацыялістычнаму спаборніцтву і ўдарніцтву ў справе асваеньня праграмы навучаньня. Вы папаўняеце рады баявога органу пралетарскай дыктатуры — РС міліцыі ў абставінах, калі рабочая кляса і ўсе працоўныя СССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі на чале з тав. Сталіным з посьпехам скончылі першую пяцігодку і змагаюцца за выкананьне баявой праграмы першага году другой пяцігодкі —пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Клясавы вораг імкнецца рознымі шляхамі весьці падрыўную работу ўнутры калгасаў, на прадпрыемстве і г. д., дзейнічаючы «цізай сапай». Ваша задача — праяўляць высокую рэвалюцыйную пільнасьць, вы крываючы манзўры клясавага ворага і вядучы бязьлітасную барацьбу з ім, шырока растлумачваючы шырокім працоўным масам задачы сацыялістычнага будаўніцтва. Я ўпэўнен, што вы, узброеныя ведамі марксызму-ленінізму, на справе пакажаце сваю адданасьць справе сацыялізму, цьвёрда праводзячы рэвалюцыйную законнасьць, пільна ахоўваючы сацыялістычную ўласнасьць ад раскрадваньня, вядучы бязьлітасную барацьбу з рэшткамі кулацтва, са спэкулянтамі і ўсімі ворагамі народу, што будзеце па-бальшавіцку змагацца за пасьпяховае праведзеньне важнейшых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў —уборкі і загатовак.

Няхай жыве пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва!

Няхай жыве камуністычная партыя на чале з тав. Сталіным!

СТАРШЫНЯ СНК БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

АДКРЫУСЯ ПЕРШЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД РАБОТНІКАЎ ЮСТЫЦЫІ

28 ліпеня г. г. у актавай залі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту а 7-й гадзіне ўвечары адкрыўся першы ўсебеларускі зьезд работнікаў органаў юстыцыі сумесна з работнікамі вытворча-таварыскіх, калгасных і сельсавецкіх судоў.

На зьезд прыбыла 300 дэлегатаў. У прэзыдыум зьезду выбраны т. т. Гападзед, Шэранговіч, Чарвякоў, Лычоў, Кавальчук, Вышынскі (намесьнік пракурора Саюзу ССР), Кузьмін, Бэнэк, Конін, Ратнэр, Дзяніскевіч, Герцовіч, Сааклян, Брагінскі, Закоўскі, Глезераў, Малюцін, Кудзельскі, Мільняноўскі, Капугін, Флексэр, Мэрзон (гомельскі пракурор), Леваноўскі (нарсудзьдзя польскай нацкамары), Шкулепа (Рагачоўскі пракурор) і інш. у ліку 35 асоб.

Пад гучныя апляўдысманты зьезд выбраў ганаровы прэзыдыум у складзе палітбюро ЦК УсеКП(б) і т. т. Постышава, Рудзутака, Гікало, Анціпава, Акулава, Тэльмана, Ленскага і Корчыка, а таксама паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) — т. Сталіну, ЦВК і СНК СССР — т. т. Молатаву і Калініну, ЦК КП(б)Б — т. Гікало, ЦВК і СНК БССР — т. т. Чарвякову і Гападзеду і Наркамюсту СССР — т. Акулову.

З вялікім дакладам аб чарговых задачах органаў юстыцыі выступіў наркамюст БССР тав. Кузьмін. Падкрэсьліўшы выключную ўвагу, якая аддаецца пытаньню рэвалюцыйнай законнасьці і задачам выпраўленьня яго з боку ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і асабіста т. Сталіным, тав. Кузьмін падрабязна акрэсьліў на зьезьдзе задачы, якія непасрэдна стаяць перад органамі юстыцыі БССР ва ўмовах новай абстаноўкі і заклікаў зьезд і ўсіх работнікаў юстыцыі БССР прыняць тэрміновыя меры па перабудове сваёй работы, зьнішчыць недахопы, якія яшчэ ёсьць у рабоце і забясьпечыць правільнае праведзеньне рэвалюцыйнай законнасьці ва ўсіх пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва.

З прывітаньнем зьезду выступіла дэлегацыя ад рабочых швейнай фабрыкі «Кастрычнік» і шкалазаводу «Пралетары», якія шэфствуюць над Наркамюстам.

Пасьля дакладу т. Кузьміна распачаліся спрэчкі, якія праводзіліся і на раніпнім пасяджэньні 29-га ліпеня. У спрэчках выступілі т. т. Паніматка (пракурор Жлобінскага раёну), Гашына (нарсудзьдзя Чавускага раёну), Назарэнка (нач. Віцебскай ФПК), Маргуо (пракурор Бабруйскага раёну), Астапаў (пракурор Чэрыкаўскага раёну), Кручкоў (следчы Асьвейскага раёну), Апейка (пракурор Глускага раёну), Гінзбург (пракурор Магілеўскага раёну), Пашуціна (нарсудзьдзя Слуцкага раёну), Барысаў (нач. Полацкага ДЗАК'у), Мэрзон (пракурор Гомельскага раёну), Казоўнікаў (старшыня вытворчага таварыскага суда МБВ чыгункі), Мільняноўскі (старшыня ваеннага трыбуналу ВВА), Глезэраў (намесьнік наркамюста).

Зьезд працягнецца тры дні.

Закрыўся ўсебеларускі зьлёт ударнікаў сплаву

На вячэрнім пасяджэньні 28 ліпеня да 9 гадзін працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Розіна. Выступіла каля 20 таварышоў: Буры (Бярэзінскі сплаўны вучастак), Сямёнаў (Сураскі), Будзяка (Пятрыкоўскі), Талстой (Нёманскі), Каршуноў (Чачэрскі), Плаўнік (Барысаўскі), Паўлоўскі (Рэчыцкі), Левін (Полацкі), Гарэлік (Віцебская сплаўкантора), Шапіра (Лесбел), Васялоў (газэта «Лесная промышленность») і інш.

Зьлёт ухваліў і падтрымаў ініцыятыву калгасьнікаў Гомельшчыны аб зборы сродкаў на пабудову авіяэскадрыльлі і пастанавіў разгарнуць збор сродкаў сярод плытагонаў Беларусі.

Замест пастановы па дакладу тав. Розіна зьлёт прыняў адозву да ўсіх плытагонаў і лесарубаў Беларусі, у якой (адозьве) выказаны канкрэтныя абавязацельствы па барацьбе за пасьпяховае скапчэньне лесазагатовак і сплаўнай кампаніі, за датэрміновую дастаўку лесаматэрыялаў фабрыкам і заводам.

На зьлёце агалошана пастанова рэспубліканскай камісіі па праведзеньні ўсесаюзнага конкурсу плытагонаў аб прэміяваньні яраду брыгад і асобных ударнікаў за ударныя тэмпы работ на сплаве.

Пасланы прывітальныя тэлеграмы СНК СССР — тав. Молатаву, ЦК КП(б)Б — тав. Гікало, СНК БССР — тав. Галадзеду, Наркамлес—тав. Лобаву, УсеЦСПС—тав. Швэрнік у.

У канцы пасяджэньня выступіў з вялікай прамовай, сакратар ЦК КП(б)Б т. Шаранговіч, ён заклікаў ударнікаў сплаву па-бальшавіцку змагацца за пасьпяховую рэалізацыю ўзятых абавязацельстваў па датэрміновым скапчэньні сплаву.

Паведамленьні

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што партбілет № 1970322 члена партыі тав. Скубей Сьцяпана Мікалаева, б. Глускай партарганізацыі і не вядома куды выбыўшага, — лічыць несапраўдным.

* * *

ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. т. Бэйнэра Віктара Янавіча, кандыдата КП(б)Б, канд. кн. № 72459; Каплана Б. Я., члена КП(б)Б, п/б №1109378; Парукова П. А. члена партыі, п/б №1543369; Наўменка Зьмітрака Раманава, б. члена партыі Глускай партарганізацыі; Анікейчыка, б старшыню РВК б. Юравіцкага раёну; Каўчука Ўсьціна Сьпірыдонавіча зьяўвіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б, або паведаміць свой адрас, месца жыхарства і работы (Менск, Савецкая 55, 3-ці паверх, 18 пакой).

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых месца знаходжаньня паказанага таварыша паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ КІРАЎНІЦТВА ДАМЭЦ гор. Масква

Гарадзкі сад — Дзяржцырк —ШАПІТО.

СЁНЬНЯ грандыёзны дзіцячы ранішнік.

ПАЧАТАК у 1 гадз. дня

вялікая праграма

Атрыкацыёны ТРЫО ФАБРЫ—жонглёры на кані.

Нямецкі атрыкацыёны клістаў - вялёсыпедыстаў ПАЎЛЬТОН І ДОЛЛЕЙ.

Удзельнічае ўся трупа.

Продаж білетаў у рабочай касе з 12—2 і з 4—6, а ў касе цыркну з 12—3 і з 6 гадз. вечара.

ПАЧАТАК вячэрняга прадстаўленьня ў 9 гадзін.

КІНО СПАРТАК з 30 ліпеня замежная камэдыя

ХРЫЗАНТЭМА

ў 6 частках.

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ.

КАСА—з 3 гадзін 30 м. дня.

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр

Ад 26 ліпеня БАМБІСТ

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Прыгодніцкі фільм ЖАХ у ПУСТЫНІ драма ў 7 частках.

Каса—ад 1 г. дня.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Замежны мастацкі фільм Небясьпечны ўзрост драма ў 6 частках.

„ПРАЛЕТАРЫ" — Пат і Паташон у кам. ЗАГАДКА МЛЫНУ

Рагачоўская дрэваапрацоўчая прафшкола

АБВЯШЧАЕ

НАБОР

на БАЗЕ сямігодкі ў ліку 20 асоб.

Заявы прымаюцца па 20-га жніўня г. г. па адрасе: Рагачоў, Цымэрманаўская 24.

Пры заяве прыкладаці наступныя дакументы ў арыгінале: 1) дакументы аб адукацыі, 2) даведка ад доктара аб здароўі, 3) даведка аб сацыяльным становішчы і матэрыяльнае 40 к